**Юры Грыбоўскі**
(Варшава)

# Польска-беларускі канфлікт у Генеральнай акрузе „Беларусь” (1941-1944 гг.)

Гісторыя польска-беларускіх узаемадачыненняў у перыяд нямецкай акупацыі (1941-1944 гг.) мае шмат „белых плямаў”, якія яшчэ чакаюць свайго даследчыка. Бясспрэчна, да ліку апошніх належыць праблема міжнацыянальных стасункаў на акупаваных немцамі паўночна-ўсходніх тэрыторыях даваеннай польскай дзяржавы. Нягледзячы на тое, што шэраг беларускіх і польскіх гісторыкаў закраналі асобныя аспекты польска-беларускіх дачыненняў пад нямецкай акупацыяй[1], гэтая тэма яшчэ далёкая ад канчатковага вычарпання.

Пасля таго, як нямецкія войскі ўлетку 1941 г. занялі тэрыторыю былых усходніх ваяводстваў 2-й Рэчы Паспалітай, паступова пачалася арганізацыя цывільнай улады на месцах. Да моманту нападу Нямеччыны на Савецкі Саюз, на тэрыторыі Трэцяга Рэйху дзейні-

[1] J. Turonek, *Kwestia białoruska w polityce obozu londyńskiego (1941-1944)*, „Studia z dziejów ZSRR i Europy Środkowej”, t. XIX, Wrocław 1983; J. Turonek, *Stosunki polsko-białoruskie w okresie drugiej wojny światowej*, „COLLOQUIUM NARODÓW (Materiały z sympozjum „Litwini, Białorusini, Ukraińcy, Polacy: przesłanki pojednania”)”, Łódź 1987; M. Wierzbicki, *Białorusini i Polacy na Zachodniej Białorusi (ziemie północno-wschodnie II Rzeczypospolitej) w latach II wojny światowej*, [w:] *„XX wiek w historii Polaków i Białorusinów. Materiały białorusko-polskiej konferencji naukowej”,* Mińsk – Warszawa 2001, s. 190-205; J. Turonek, *Stosunki polsko-białoruskie w Okręgu Białostockim 1941-1944*, [w:] *Stosunki polsko-białoruskie w województwie białostockim w latach 1939-1956*, Warszawa 2005, s. 43-48; H. Piskunowicz, *Polskie podziemie a kwestia białoruska w latach 1941-1944*, [w:] *Stosunki polsko-białoruskie w województwie białostockim w latach 1939-1956*, Warszawa 2005, s. 49-63; Д. Крывашэй, *Польская супольнасць Беларусі пад час акупацыі*, [у:] *Беларусь у выпрабаваннях Вялікай Айчыннай вайны: масавыя забойствы нацыстаў*, Мінск 2005, с. 139-148.

чаў Беларускі камітэт самапомачы (БКС), дзеячы якога прыбылі за нямецкімі войскамі на акупаваныя тэрыторыі Беларусі з мэтай запачаткавання беларускага нацыянальнага жыцця. Аднак беларускі рух, які спадзяваўся з дапамогай новых уладаў стварыць умовы дзеля адраджэння беларускай дзяржаўнасці, адчуваў востры недахоп кадраў, якімі належыла абсадзіць цывільную адміністрацыю на ўзроўні паветаў і гмінаў. Тым часам сітуацыя складалася такім чынам, што немцам патрэбна было пільна арганізаваць працу ўстановаў мясцовай улады. Дзеля ажыццяўлення гэтага трэба было адшукаць кваліфікаваных урадаўцаў (старастаў, пісараў, сакратароў, начальнікаў паліцыі і г.д.). Большасць беларускага насельніцтва былой 2-й Рэчы Паспалітай была рэпрэзентаваная малазямельным сялянствам, тым часам як сярод палякаў значную частку складалі прадстаўнікі сярэдніх і вышэйшых класаў. Неўзабаве брак адпаведных кадраў сярод беларусаў кантраставаў з дастатковай іх колькасцю сярод асобаў польскай нацыянальнасці, многія з якіх займалі адміністрацыйныя пасады мясцовага ўзроўню яшчэ да верасня 1939 г. У выніку ў хуткім часе палякі абсадзілі практычна ўсе пасады ў павятовых і гмінных управах на Наваградчыне і Віленшчыне — пачынаючы ад сактаратроў і пісараў да службоўцаў паліцыі парадку. Вядома, што некаторыя пайшлі ў акупацыйную адміністрацыю са згоды альбо па загаду камандавання Саюза ўзброенага змагання (Związek Walki Zbrojnej), выконваючы, па сутнасці, ролю агентуры польскага падполля.

Існуючая сітуацыя не магла таксама не турбаваць беларускіх нацыяналістаў, якія трактавалі нямецкую акупацыю як зручны сродак дзеля ўзмацнення сваіх уплываў і разлічвалі на адраджэнне ў будучыні беларускай дзяржаўнасці. Варта аднак адзначыць, што незадавальнення беларускіх сілаў было недастаткова, каб выклікаць канфлікт паміж польскай і беларускай палітычнымі элітамі. Асноўную ролю ў яго праявах на тэрыторыі Генеральнай акругі „Беларусь” адыгралі нямецкія ўлады, якія бачылі ў завастрэнні нацыянальных антаганізмаў адзін са сродкаў аслаблення палітычнай актыўнасці паняволеных народаў, што адпаведна значна аблегчвала кантроль і давала надзею на гарантыю іх лаяльнасці адносна захопнікаў. Папаўненне мясцовай адміністрацыі выклікала падвойную рэакцыю акупантаў. З аднаго боку менавіта за кошт польскага насельніцтва было магчыма набраць патрэбную колькасць кваліфікаванага і прафесійнага персаналу дзеля арганізацыі належнага функцыянавання адміністрацыі на акупаваным абшары. З іншага боку, штораз больш узрастала небяспека ўтварэння моцнага польскага цэнтру на заплеччы нямецкіх войскаў. Неўзабаве да аб-

вастрэння міжнацыянальных супярэчнасцяў падчас нямецкага панавання дайшло амаль у кожным з акупаваных рэгіёнаў. У асобных месцах гэта прывяло да крывавых месіваў, яскравым прыкладам якіх можа служыць польска-ўкраінская расправа на Валыні.

З траўня 1942 г. Галоўная ўправа бяспекі Трэцяга Рэйху распачала г.зв. „Polenaktion" (польская акцыя) — мэтанакіраваную антыпольскую рэпрэсіўную акцыю, якая палягала на „чыстцы" адміністрацыі ад асобаў польскай нацыянальнасці. Акцыі гэтай спадарожнілі фізічнае вынішчэнне і гвалт. Пры гэтым нярэдка ахвярамі тэрору рабіліся людзі, якія ўвогуле не былі звязаныя з польскай канспірацыяй.

„Польская акцыя" на тэрыторыі Генеральнай акругі „Беларусь" адбывалася адначасна з падтрымкай беларускага руху. Генеральны камісар Беларусі Вільгельм Кубэ выразна акрэсліў, што ў сваёй палітыцы будзе рабіць стаўку на беларускіх нацыяналістаў. Кубэ ўважаў за неабходнае не адхіляцца ад рэпрэсіўнай палітыкі ў дачыненні да польскага пытання. У якасці аргументу выступала насцярога, што польскі рух на тэрыторыі акругі ўяўляе сабой досыць моцную сілу, якая ў найбольш нязручны для акупантаў момант „падыме галаву" на заплеччы нямецкіх войскаў[2]. У адрозненні ад палякаў, беларускія нацыянальныя сілы былі досыць кволымі, каб у найбліжэйшы час рэальна пагражаць інтарэсам Нямеччыны. Менавіта таму, на думку Кубэ, неабходна было спрыяць узмацненню беларускіх уплываў. У межах палітыкі падтрымкі беларусізацыі адбывалася развіццё беларускамоўнай адукацыі. На зломе 1941-1942 гг. у Генеральнай акрузе „Беларусь" ужо існавала 3 458 школаў. Цягам 1943 г. было запачаткавана яшчэ каля 30 беларускіх школаў, якія сталіся асяродкамі нацыянальнага выхавання беларускай моладзі. Развіццё атрымала нацыянальна-культурніцкае жыццё (тэатры, літаратура)[3]. У 1942 г. з дазволу нямецкіх уладаў у Менску была запачаткавана грамадская арганізацыя Беларуская народная самапомач (БНС) на чале з Іванам Ермачэнкам. Побач з дабрачыннымі справамі БНС бярэ на сябе абавязак займацца арганізацыяй нацыянальна-культурніцкага жыцця ў Генеральнай акрузе „Беларусь". Ажыццявіць беларусізацыю акупаванага абшару было немагчыма не закрануўшы інтарэсаў палякаў. Менавіта таму канфлікт паміж польскай і беларускай палітычнымі ўплывамі быў не-

[2] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НАРБ), ф. 4683, воп. 3, спр. 978, л. 135-136.

[3] M. Ruchniewicz, *Stosunki narodowościowe w latach 1938–1948 na obszerze tzw. Zachodniej Białorusi*, [w:] *Przemiany narodowościowe na kresach wschodnich II Rzeczypospolitej 1931–1948*, Toruń 2004, s. 290.

пазбежны, і ў рэшце рэшт ён з цягам часу набыў характар сапраўднай барацьбы, якая каштавала жыццця сотням жыхароў. Варта тут прыгадаць удзел беларускай паліцыі ў неаднаразовых карных акцыях гітлераўцаў супраць палякаў.

Падтрымка акупантамі беларускіх нацыянальных сілаў не магла не заангажаваць апошніх у ажыццяўленне „польскай акцыі". Якое месца ў антыпольскай акцыі займалі дзеячы беларускага руху? Не выклікае сумневу, што асноўным матывам да ажыццяўлення „Polenaktion" паслужыла заўважнасць антаганізмаў паміж беларускімі і польскімі палітычнымі ўплывамі. Гэта дало акупантам надзею на паглыбленне міжнацыянальнага канфлікту і выкарыстанне беларускіх нацыяналістаў у змаганні з польскімі чыннікамі. Так, яшчэ ў жніўні 1941 г. экспазітура СС у Генеральнай акрузе „Беларусь" даносіла ў сваіх справаздачах у Берлін аб тым, што „нацыянальная барацьба паміж беларусамі і палякамі ўступіла ў вастрэйшую стадыю"[4]. Адначасова адзначалася, што па сваёй варожасці да немцаў палякі саступалі хіба толькі жыдам. У сувязі з гэтым аслабленне польскіх уплываў на акупаваным абшары бачылася ў падтрымцы беларускага нацыянальнага руху і распальванні ў апошніх антыпольскай акцыі. Беларускія нацыяналісты яшчэ напярэдадні пачатку антыпольскай акцыі яскрава выказвалі свае антыпольскія настроі. У прыватнасці, „Менская газэта" 15 студзеня 1942 г. пісала, што „цяпер нашым заданнем з'яўляецца змаганне з ворагам унутраным (...) недабіткамі польскіх паноў, падпанкаў, польскіх ксяндзоў у Заходняй Беларусі, якія ачмуцілі нацыянальна і далей чмуцяць частку нашага насельніцтва"[5]. На бачынах беларускай прэсы, якая выдавалася пад нямецкай апекай, палякі адкрыта называліся хаўруснікамі „жыда-камуны", якія „хваравіта летуценяць аб польскім нацыяналізме" і „пад уплывам якіх знаходзіцца значная частка атуманенага сялянства Заходняй Беларусі". Польская агітацыя характарызавалася як „польска-касцельная чмуша"[6].

Адным са спосабаў змагання беларускіх нацыяналістаў з польскім элементам было спрыянне дэпартацыі апошніх на прымусовыя працы ў Нямеччыну. Беларускія калабарацыяністы атрымалі дзеля гэтага вельмі зручны момант, паколькі 30 кастрычніка 1942 г. Генеральны камісар Беларусі Вільгельм Кубэ накіраваў распараджэнне да старшыні БНС Івана Ермачэнкі, у якім утрымліваўся заклік да актыўнага супрацоўніцтва па вярбоўцы працоўнай сілы ў Рэйх.

[4] Д. Крывашэй, *Польская супольнасць Беларусі пад час акупацыі*, с. 140.
[5] „Менская газэта" 1942, 15 студзеня.
[6] „Беларуская газэта" 1942, 18 ліпеня.

Ужо 16 лістапада 1942 г. І. Ермачэнка выдаў раённым і гарадскім кіраўнікам арганізацыі загад аб правядзенні вярбоўкі насельніцтва. Заручыўшыся падтрымкай з боку акруговых камісараў, ён загадаў раённым кіраўнікам БНС разам з мясцовай раённай і валасной адміністрацыяй, а таксама нямецкімі аддзеламі працы складаць спісы асобаў, якія падлягалі вывазу ў Нямеччыну. Згодна з інструкцыяй І. Ермачэнкі ад 18 лістапада 1942 г. кожны раён мусіў выставіць не менш 120 асобаў. Пры гэтым старшыня БНС падкрэсліваў, што ў першую чаргу „ў спісы гэтыя павінны быць унесены ўсе тыя асобы, якія будучы беларусамі няслушна залічваюць сябе да палякаў і праз гэта ніякага актыўнага ўдзелу ў адбудове Бацькаўшчыны не бяруць, апрача гэтага ў спісы гэтыя павінны быць унесены і асобы польскай нацыянальнасці”[7]. Неўзабаве, мясцовая раённая адміністрацыя ў супрацоўніцтве з актывам БНС на месцах намагалася ажыццявіць згаданае даручэнне. Яскравым прыкладам рэалізацыі антыпольскай акцыі падчас вярбоўкі насельніцтва на прымусовую працу ў Рэйх можа паслужыць справаздача войта Качаноўскай гміны Нясвіжскага павету С. Харытончыка ад 2 траўня 1943 г., які адмыслова для нямецкіх вайсковых уладаў склаў спіс жыхароў гміны польскай нацыянальнасці, якія, на яго думку, утрымлівалі сувязь з падполлем альбо партызанамі. У пасляслоўі да пададзенага спісу войт адзначаў: „Усіх гэтых людзей трэба выслаць на работу ў Нямеччыну, каб не пайшлі ў лес. Зазначаю, што сярод іх вядзецца шырокая бандыцкая агітацыя. Адначасова зазначаю, што на тэрыторыі Капыльскага раёна паспяхова арганізуецца бандыцкая армія бандытаў (рознага зброду) з вярнуўшыхся з Палесся, што перавышае 2 000 чалавек, якія маюць кіраўніцтва 6 польскіх афіцэраў з былога 27 уланскага палка ў Нясьвіжы. (...) Зазначаю, што трэба ўбраць агентаў і супольнікаў, якія маюць моцную сувязь з партызанамі і ў якіх ужо ёсць браты і швагры ў лесе ў партызанах”[8]. Сваю пазіцыю С. Харытончык матываваў тым, што „ўсе вышэйпаданыя асобы маюць сувязь з бандытамі і п’юць з імі гарэлку”[9]. Пры тым войт у аднолькавай ступені інкрымінаваў польскаму насельніцтву прыналежнасць як да польскай, так і да савецкай партызанкі. Гэтыя, на першы погляд жартаўлівыя фармулёўкі, якія потым траплялі ў рукі гестапа, пазней каштавалі жыцця многім жыхарам[10]. Зас-

[7] *Принудительный труд белорусского населения в Австрии. Документы и материалы*, Грац – Минск 2003, с. 117.

[8] НАРБ, ф. 370, воп. 6, спр. 48. л. 137-139.

[9] Там жа, л. 141.

[10] *Памяць. Нясвіжскі раён. Гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі*, Мінск 1998.

лугоўвае ўвагі факт, што беларускія нацыяналісты ўвогуле прапаноўвалі нямецкім уладам дэпартаваць з Наваградчыны і Слонімшчыны 4-6 тыс. палякаў, прысутнасць якіх перашкаджала будаванню „новага парадку". Галоўным чынам, гэта тычылася польскай інтэлігенцыі — настаўнікаў, чыноўнікаў, абшарнікаў, ксяндзоў[11].

Бадай асноўным сродкам узаемнай беларуска-польскай барацьбы была дэнунцыяцыя перад нямецкімі ўладамі. Даносы назіраліся з першых дзён нямецкай акупацыі і былі накіраваныя супраць савецкіх актывістаў і шараговых прыхільнікаў савецкага ладу. З'ява гэтая аднак не залежыла ад нацыянальнай глебы. Нягледзячы на тое, што найчасцей дэнунцыятарамі выступалі палякі, а ў якасці ахвяраў значны адсотак складалі беларусы, належыць тут шукаць эканамічныя падставы альбо ўчынкі ўласнай помсты. Прычынай дэнунцыяцыі рабіліся яшчэ свежыя крыўды, якія выводзіліся з вераснёўскіх дзён 1939 г. Вядомы выпадкі, калі беларускія сяляне ў верасні 1939 г. віталі Чырвоную Армію, а потым удзельнічалі ў рабунках абшарніцкіх маёнткаў і нават забойствах іх колішніх гаспадароў. З прыходам нямецкай арміі ў чэрвені 1941 г. пакрыўджаныя вераснёўскімі падзеямі 1939 г. атрымалі вельмі зручны момант, каб учыніць справядлівасць і пакараць сваіх нядобразычліўцаў. Так, напрыклад, ужо 30 чэрвеня 1941 г. у вёсцы Малыя Князёўцы (Лідскі павет) нямецкія жаўнеры арыштавалі і расстралялі 20 савецкіх актывістаў беларускай нацыянальнасці[12]. У кастрычніку 1942 г. у вёсцы Падзяменне на Кобрыншчыне па даносе было расстраляна каля 40 асобаў, як акт помсты за масавыя забойствы польскіх вайскоўцаў у верасні 1939 г. У вёсцы Чудзель (20 км на ўсход ад Белавежы) па даносе паляка Юзафа Стоека 18 ліпеня 1941 г. жаўнеры 309-га паліцыйнага батальёну арыштавалі 9 беларусаў, якія ў міжваенны час належылі да сімпатыкаў камунізму[13]. Прыклады такога кшталту магчыма працягваць надалей. Аднак не выпадае тут казаць пра нейкія нацыянальныя антаганізмы, паколькі асноўным крытэрыем помсты выступалі прыватныя парахункі і стаўленне да савецкіх акупантаў у верасні 1939 г. Апрача таго, сярод ахвяраў першых месяцаў нямецкай акупацыі было шмат прадстаўнікоў наплывовага элементу — беларусаў з Усходняй Беларусі і расейцаў з РСФСР.

Трэба аднак зазначыць, што таўро сімпатыкаў камунізму выка-

[11] Archiwum Instytutu Pamięci Narodowej (далей: AIPN), sygn.: BU, 00231/228, t. 3.

[12] *Памяць. Іўеўскі раён*, Мінск 2002, с. 220.

[13] НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 974, л. 44.

рыстоўвалі ўдзельнікі польскай канспірацыі ў змаганні з беларускімі нацыяналістамі. Польскі бок найчасцей маляваў у вачах СД непажаданых беларусаў як прыхаваных камуністаў і прыхільнікаў савецкай улады. У прыватнасці, у Баранавічах з моманту прыходу нямецкіх войскаў мясцовая адміністрацыя была абсаджаная палякамі. У сувязі з гэтым распачаліся арышты і расстрэлы нацыянальна свядомых беларусаў, якія, не маючы нічога супольнага з камуністычнай уладай, атрымалі ад магістрату таўро „савецкіх актывістаў"[14]. Канкрэтныя прыклады гэткага кшталту яшчэ будуць разгледжаныя пазней.

Архіўныя крыніцы дазваляюць досыць поўна адлюстраваць дэнунцыяцыю, якой займаліся беларускія нацыяналісты падчас змагання са сваімі польскімі канкурэнтамі. Беларусы выстаўлялі палякаў у якасці замаскаваных агентаў польскага эміграцыйнага ўраду ў Лондане і паплечнікаў Арміі Краёвай, намагаючыся давесці акупантам аб іх шкоднасці для справы пабудовы „новага нямецкага парадку". Дзеячы БНС абвінавачвалі палякаў у спробах перашкодзіць беларускаму народу „актыўна дапамагаць будаваць Новы, прынесены (...) Вялікай Нямецкай Арміяй, Парадак"[15].

Трэба падкрэсліць, што вынік канфлікту ў пэўнай ступені залежыў ад рэгіёну. Так, напрыклад, як немцы, гэтак нават і беларускія нацыяналісты, усведамлялі немагчымасць беларусізацыі Лідскай акругі, дзе пераважную большасць насельніцтва складалі палякі і беларусы-каталікі, якія сімпатызавалі польскаму падполлю. З актыўнасцю польскай канспірацыі на тамтэйшым абшары быў звязаны і нізкі ўзровень развіцця беларускай адміністрацыі на Лідчыне. Яскравым чынам сітуацыю ў Лідскай акрузе характарызавалі рапарты Арміі Краёвай (АК), у якіх, між іншым, магчыма было прачытаць наступнае: „Шчучынскі павет уваходзіць у склад Лідскага гэбітскамісарыяту (...) на якім мясцовая нямецкая ўлада дэманструе максімум зразумеласці і талерантнасці ў адносінах да польскага насельніцтва. Шчучынскі павет прыгадвае Бабруйск і Жлобін у часы Доўбар-Мусніцкага. Нямецкая ўлада абмяжоўваецца да мястэчкаў, улада чырвоных — на супрацьлеглым баку Нёмана. Польскія аддзелы праводзяць рэгулярны набор прызыўнікоў, солтысы фармальна ўручаюць павесткі (...) варшавякі з УБК (ударныя кадравыя батальёны — Ю. Г.) даводзяць, што ва ўсёй Польшчы няма настолькі спрыяльных варункаў, як на Шчучыншчыне"[16]. У Лідскай акрузе

[14] Б. К'яры, *Штодзённасць за лініяй фронту. Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 г.)*, Мінск 2005, с. 290.

[15] НАРБ, ф. 384, воп. 1, спр., л. 1-3.

[16] J. Turonek, *Stosunki polsko-białoruskie w okresie drugiej wojny światowej*, s. 37.

налічвалася ўсяго 743 сяброў БНС (дзеля параўнання ў Слонімскай — 6 тыс., Баранавіцкай — 8 910, Менскай — 9 тыс.). На пачатку 1944 г. сябры БНС па Лідскай акрузе звярнуліся ў галоўную ўправу арганізацыі з пільнай просьбай аб скіраванні настаўніцкіх кадраў з Наваградскай акругі[17]. Найлепшым чынам сітуацыю ў Лідскай акрузе характарызаваў тамтэйшы гэбітскамісар, які адзначаў наступнае: „Паколькі акруга была ў асноўным заселеная палякамі, але кіраўніцтва павінна было пераходзіць да беларусаў, то ў хуткім часе стварылася польская апазіцыя, якая да 1944 г. разраслася настолькі, што ў акрузе налічвалася амаль 6 500 арганізаваных польскіх бандаў (sic!). У сувязі з польскімі тэрактамі ў хуткім часе беларускі ўплыў быў цалкам ліквідаваны да такой ступені, што ў апошні час было немагчыма падабраць на кіраўнічыя пасады ў сістэме самакіравання асобаў з ліку беларусаў. Самакіраванне працавала ў надзвычайна цяжкіх умовах (...). Палякі байкатавалі беларускія школы і засноўвалі сваю адукацыю (...). БНС і СБМ (Саюз беларускай моладзі — Ю. Г.) у акрузе нічым сябе не праявілі. Паліцыя таксама была ненадзейнай"[18]. Вельмі падобную сітуацыю прадстаўляла кіраўніцтва БНС у справаздачы па Лідскай акрузе ад 22 траўня 1944 г., у якой гаварылася: „Поўная бяздзейнасць кіраўнікоў акруговага аддзелу ў справе арганізацыі аддзелаў БНС у павеце прывяла да таго, што дасюль не паўсталі аддзелы ў Лідскім, Жалудоцкім, Радуньскім паветах, спынілі сваё існаванне аддзелы ў Шчучынскім, Івейскім, Васілішкаўскім і Юрацішкаўскім паветах. (...) Няма ніякага прыросту сябраў БНС за перыяд з ліпеня 1943 па красавік 1944 г."[19]

Нямецкія ўлады рабілі спробы ўтаймавання польскай акцыі шляхам рэпрэсіяў. Улетку 1942 г. у Лідзе і ваколіцах (Іўе, Беліца, Курган) паліцыя і жандармерыя арыштавалі каля 300 палякаў, з якіх 50 атрымалі выракі смерці, у тым ліку некалькі каталіцкіх святароў[20]. Пасля ўтрымання ў Лідскай вязніцы 13 сакавіка 1943 г. яны былі расстраляныя ў лесе за былымі кашарамі 77-га пяхотнага палка[21].

Складана справа выглядала ў Ганцавіцкай акрузе, дзе не выпадала казаць пра 100% беларусізацыю. Падзеі разгортваліся над-

[17] НАРБ, ф. 384, воп. 1, спр. 267, л. 4.
[18] НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 1043, л. 315.
[19] НАРБ, ф. 384, воп. 1, спр. 267, л. 6-7.
[20] Z. Boradyn, *Niemen rzeka niezgody. Polsko-sowiecka wojna partyzancka na Nowogródczyźnie 1943–1944*, Warszawa 1999, s. 33.
[21] A. Galiński, *Eksterminacja inteligencji polskiej latem 1942 r. w województwie nowogródzkim (problemy badawcze)*, „Biuletyn Głównej Komisji Badania Zbrodni przeciwko Narodowi Polskiemu Instytutu Pamięci Narodowej", 1991, t. 33, s. 188.

звычай драматычна. Архіўныя дакументы дазваляюць вызначыць як выглядала справа ў Ганцавічах і раёне. З усталяваннем нямецкай цывільнай улады пасаду раённага камісара паліцыі ў Ганцавічах абняў Станіслаў Акінчыц, ураджэнец цэнтральнай Польшчы (праўдападобна з Варшавы), які ўтрымліваў шчыльныя стасункі з польскай канспірацыяй. Неўзабаве тутэйшая паліцыя практычна цалкам складалася з палякаў. У 1942 г. на хвалі антыпольскай акцыі Акінчыц быў зменены на беларуса Яўстафія Філіповіча[22]. Акурат апошні правёў чыстку шэрагаў паліцыі ад прыхільнікаў ранейшага шэфа і змену сваімі людзьмі, што на практыцы змяніла нацыянальнае аблічча паліцыйных пастарункаў. Адначасова ў раёне паўстала арганізацыя БНС. Антыпольская акцыя распачалася з арыштаў прадстаўнікоў мясцовай польскай інтэлігенцыі. Нямецкія ўлады, пры дапамозе супрацоўнікаў БНС, пачалі складаць спісы „небяспечнага элементу”. Гэныя спісы потым траплялі ў паліцыю дзеля санкцыянавання арышту. У гэтай сітуацыі Філіповічу даводзілася двойчы ставіць свой подпіс пад спісамі з прозвішчамі — першы раз у якасці сябра БНС, які раіў абясшкодзіць „небяспечных” шляхам ізалявання ад супольнасці і другі — у якасці начальніка раённай паліцыі выдаваць загады на непасрэдныя арышты. У дачыненні да большасці з арыштаваных палякаў былі вынесеныя смяротныя выракі, пасля чаго ахвяры былі расстраляныя. Паводле звестках ўідавочцаў, такім чынам было расстраляна больш за 60 асобаў. У ліку замардаваных апынуліся, між іншым, каталіцкія ксяндзы Гацвіцкі і Уладыслаў Вархаповіч. Як сцвярджаюць відавочцы, начальнік паліцыі Філіповіч асабіста браў удзел у арышце былога начальніка раённай паліцыі, вышэйзгаданага Акінчыца, ксяндза Вархаповіча і сакратара суда ў Ганцавічах, якіх разам з іншымі арыштаванымі вывезлі ў Калдычаўскі лагер, дзе адбылася экзекуцыя[23].

Нягледзячы аднак на антыпольскія рэпрэсіі беларускім нацыяналістам не ўдалося дамагчыся чаканага выніку ў беларусізацыі рэгіёну. Гэбітскамісар Ганцавіцкай акругі адзначаў, што „ў акрузе поўная адсутнасць беларускай інтэлігенцыі, здольнай да правядзення нацыянальнай дзейнасці. Настаўнікі гэта пераважна палякі”[24].

Вельмі сціплая інфармацыя захавалася наконт польска-беларускіх узаемадачыненняў у Глыбоцкай акрузе. Вядома аднак, што там

[22] Пасля вайны Яўстафій Філіповіч пасяліўся на тэрыторыі ПНР у Зялёна-Гурскім ваяводстве. Аднак быў пазней распазнаны і арыштаваны. У 1954 г. за здзейсненыя злачынствы быў асуджаны ваяводскім судом у Зялёнай Гуры на смяротную кару. Вырак быў выкананы. AIPN, sygn.: BU, 00231/228, t. 1.

[23] AIPN, sygn.: BU, 00231/228, t. 1, k. 226-227.

[24] НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 1043, л. 351.

былі моцныя польскія ўплывы, дзе ў цывільнай адміністрацыі пераважалі чыноўнікі польскай нацыянальнасці. Да выняткаў належыў Браслаўскі павет, дзе практычна з самага пачатку нямецкай акупацыі ачольнікі мясцовай цывільнай улады прытрымліваліся прабеларускага кірунку. У мястэчку і ваколіцах быў сарганізаваны беларускі батальён самаахловы і паліцыя парадку. Сярод тамтэйшых беларускіх нацыяналістаў, якія найбольш вылучаліся антыпольскімі поглядамі, магчыма пералічыць шэфа адміністрацыі ў Браславе Забароўскага[25], школьнага інспектара ў Міёрах і адначасна кіраўніка мясцовай арганізацыі БНС Альфонса Угарэнка, братоў Мікалая і Паўла Дварэцкіх. Акурат апошнія вылучыліся тым, што бралі актыўны ўдзел у складанні спісаў асобаў, падлягаючых вывазу на прымусовую працу ў Нямеччыну. Пры гэтым яны свядома рупіліся пра тое, каб у лік кандыдатаў на вываз трапілі асобы польскай нацыянальнасці. Заслугоўвае ўвагі факт, што, падобна як шмат іншых беларускіх нацыяналістаў, пасля вайны Дварэцкія пад выглядам палякаў уцяклі ў Польшчу, шукаючы ратунку перад савецкімі ўладамі ў краіне, супраць якой яны так варожа выказваліся ў часе нямецкай акупацыі[26].

У верасні 1941 г. распачала сваю працу цывільная адміністрацыя на Вілейшчыне, якая на ніжэйшым узроўні амаль цалкам складалася з палякаў. З цягам часу нямецкія акупанты зрабілі захады па „дэпаланізацыі" акругі. Архіўныя дакументы дазваляюць узнавіць яе працэс у шэрагу рэгіёнаў. Наконт стаўлення мясцовых беларускіх нацыяналістаў да польскага пытання сведчыць справаздача аб дзейнасці БНС па Вілейскай акрузе ў перыяд з 1 ліпеня па 30 верасня 1942 г., у якой чытаем: „Беларускі селянін павінен бараніцца перад польскім зямляцтвам, якое хоча схапіць яго ў свае брудныя лапы. Карыстаючыся з таго, што шмат палякаў валодае нямецкай мовай і прыгатаваныя працаваць ва ўстановах, лезе, як усялякі бруд ва ўсе шчыліны, маной і хлуснёй намагаецца здабыць давер нямецкіх уладаў, ачарняючы беларусаў і прадстаўляючы іх у найгоршым святле, кажучы: „Бялорусін ест комуністэм". Цынізм палякаў даходзіць да таго, што яны называюць сябе беларусамі альбо фольксдойчамі, трымаючы за спіной у руцэ нож супраць аднаго, як і другога"[27].

У адміністрацыі Вілейскага раёна (апрача Куранецкай воласці) галоўныя пасады займалі чальцы БНС альбо прыхільнікі беларусізацыі (старшыня — Васілеўскі, намеснік старшыні — Сапешка, Ка-

[25] J. Gdański, *Zapomniani żołnierze Hitlera*, Warszawa 2005, s. 159.
[26] AIPN, sygn.: BU, 00231/228, t. 3.
[27] НАРБ, ф. 392, воп. 1, спр. 1, л. 13.

товіч — ахова здароўя, Пратасевіч — школьны інспектар і г.д.). Падобным чынам выглядаў стан рэчаў у Радашковіцкім раёне, дзе беларускім нацыяналістам з самага пачатку акупацыі ўдалося апанаваць сітуацыяй. На чале раёну стаяў беларус Аляксандр Галяк. Адначасова сітуацыя не на карысць беларусаў існавала ў Мядзельскім, Крывіцкім і Ільянскім раёнах, дзе цывільная адміністрацыя была абсаджаная палякамі[28].

Цікавай была справа на Ашмяншчыне. Уласцівая першым месяцам нямецкага панавання дамінацыя асобаў польскай нацыянальнасці ў мясцовай адміністрацыі ў хуткім часе змянілася на карысць беларускіх сілаў. Згодна з загадам гэбітскамісара Вілейскай акругі на пасаду начальніка Ашмянаў быў вызначаны беларус Юстын Мурашка, які змяніў паляка Францішка Скшада. Камендантам мясцовай паліцыі стаў беларус Алесь Калодка, які заступіў на гэтай пасадзе паляка Станіслава Руновіча. Адначасна школьным інспектарам стаў Мар'ян Пецюкевіч, які пасунуў паляка Яна Франчака. У 1942 г. адбылася змена шыльдаў з назвамі вуліцаў з польскай мовы: вялікіх — на нямецкую і літоўскую, малых — на нямецкую і беларускую. Разам з тым, вядома, што ў паліцыі і іншых установах (напрыклад, у біржы працы) надалей працавалі чальцы польскага падполля. Беларускія нацыяналісты канчаткова страцілі свае пазіцыі з сярэдзіны 1942 г., калі Ашмянскі раён быў перададзены ў склад Генеральнай акругі „Літва"[29].

Захавалася інфармацыя адносна стану рэчы на Валожыншчыне. „Беларуская газэта" ў лістападзе 1941 г. паведамляла наступнае: „Сапраўдны барацьбіт за беларускую справу павятовы старшыня Ю. Мурашка прыняў на працу шмат маладых беларускіх кадраў. Аднак сярод настаўнікаў ёсць шмат такіх, якія чакаюць на вяртанне польскіх школаў, польскай паліцыі і польскіх урадаў. Ёсць аднак тыя, якія раней варожа ставіліся да беларускай справы, а зараз самі наварочваюць на беларускасць. На 3/4 апалячаны раней павет зараз ачышчаны ад пальшчызны. Агенты „Вялікай Польшчы" перабіраюцца ў іншыя паветы, за выняткам Вішнеўскай воласці, дзе палякі яшчэ моцныя і чакаюць на Сікорскага"[30].

Як аднак паказаў досвед, выказванні гэткага кшталту аказаліся занадта самаўпэўненымі. У рэчаіснасці, у цывільнай адміністрацыі надалей працягвала працаваць пэўная частка палякаў, якія намагаліся пасунуць беларускі элемент. Уначы з 8 на 9 траўня 1942 г.

[28] А. Калодка, *Беларуска-польскія суадносіны ў Вялейшчыне падчас нямецкай акупацыі ў 1941-1944 гг.*, „Зважай", сакавік 1981, с. 2-4.

[29] *Памяць. Ашмянскі раён,* Мінск 2003, с. 298-299, 349.

[30] „Беларуская газэта" 1941, 27 лістапада.

у Валожыне дайшло да арышту нямецкай жандармерыяй беларускага персаналу цывільнай раённай управы. У выніку ў мясцовай вязніцы апынуліся кіраўнік гарадской і раённай паліцыі Ждановіч, начальнік турмы Пашкоўскі і інш. Арышт стаўся вынікам даносу з боку палякаў (Корсак, Карашэвіч), якія беларускай адміністрацыі ставілі закід у таемным спачуванні савецкай ўладзе. Насамрэч арыштаваныя былі ворагамі ўсяго савецкага, аб чым сведчыць факт, што ў перыяд 1939-1941 гг. яны траплялі пад пераслед з боку савецкай улады. Праз некалькі дзён быў наступны данос, які ўтрымліваў ужо апраўданне арыштаваных з патрабаваннем вызваліць іх з-пад варты. Аўтар допісу ў цэнтралю БНС, беларус, наракаў у сваю чаргу на палякаў, якія, кіруючыся нацыяналістычнымі пачуццямі, „убайдосілі" сумленных беларусаў у вязніцу, каб заняць іх месца[31].

Да рэгіёнаў, у якіх у выніку змагання пераважылі беларускія ўплывы, належыў Наваградак і ваколіцы. Першапачаткова, мясцовая адміністрацыя была абсаджаная асобамі польскай нацыянальнасці, пасаду бурмістра горада займаў інж. У. Смольскі. Аднак у хуткім часе адбыліся грунтоўныя змены. Замест арыштаванага і пазней расстралянага паляка Смольскага на пасаду бурмістра быў вызначаны беларус Панько (пазней Буляк). Уначы з 28 на 29 чэрвеня 1942 г. на тэрыторыі Наваградскага павету распачаліся масавыя арышты палякаў. У ліку арыштаваных апынуліся тры каталіцкія святары — кс. Міхал Далецкі, кс. Юзаф Кучынскі і кс. Стэфан Сечка[32]. Арыштаваныя былі зняволеныя ў турме Баранавіцкага СД. Пасля допытаў 63 асобы былі расстраляны 31 ліпеня 1942 г. у Наваградку побач з былымі польскімі вайсковымі кашарамі. Арышты адбываліся на падставе імянных спісаў, падрыхтаваных беларускімі нацыяналістамі. На думку польскага падполля, ініцыятарамі антыпольскай акцыі на Наваградчыне была „шасцёрка" беларускіх дзеячаў, а менавіта: 1) Панько — бурмістр Наваградка (да снежня 1942 г.), 2) Дзяковіч — даваенны магістрацкі чыноўнік, 3) Скрыбец — дырэктар беларускай гімназіі, 4) Якуцевіч — старшыня БНС у Наваградку, 5) Барыс Рагуля — кіраўнік Саюза беларускай моладзі (СБМ) у Наваградку. Прозвішча яшчэ аднаго ўдзельніка гэтага спісу не падавалася. Пры гэтым зазначалася, што „малады Рагуля і стары Дзяковіч" былі найбольш зацятымі „палякажэрцамі". Апрача таго, на правінцыі ў спіс асобаў, якія вылучыліся актыўнасцю падчас антыпольскай акцыі, трапілі Аляксандр

[31] НАРБ, ф. 384, воп. 1, спр. 71, л. 1-3.

[32] A. Zienkiewicz, *Ofiara przyjęta (w dwudziestą piątą rocznicę śmierci sióstr w Nowogródku)*, Rzym 1968, s. 8.

Аўдзей (былы дарожны тэхнік, бурмістр Стаўбцоў і Нясвіжа), Бурак з Івянца (былы інжынер) і „рэнегат Кушаль”, якія складалі спісы палякаў, падлеглых ліквідацыі альбо арышту[33]. Па версіі польскага падполля арышты інтэлігенцыі былі таксама выкліканыя даносамі ў гестапа і СД з боку былога сенатара парламента 2-й Рэчы Паспалітай Васіля Рагулі[34].

Аднак нават пасля жахлівых рэпрэсіяў супраць палякаў апошнія канчаткова не страцілі свой уплыў. Пацвярджэнне магчыма адшукаць нават у крыніцах савецкай партызанкі. Яскрава сведчыць пра гэта рапарт партызанскага сувязнога Валянціна Таўлая, які намагаўся абмаляваць агульную сітуацыю ў акупаванай Наваградчыне і пісаў наступнае: „Нягледзячы на тое, што пасля першай сутычкі нацыяналістычных ачольнікаў беларускай інтэлігенцыі з такімі самымі ачольнікамі польскімі ўсталявалася незначная перавага першых (у раёне і з пэўнымі выняткамі ў валасных управах, у школьнай сістэме), польская нацыяналістычная інтэлігенцыя, якая паходзіць пераважна з былога польскага дзяржаўнага апарату, амаль цалкам і да канца складае кадры гаспадарчых органаў, сельскагаспадарчых аддзелаў, арганізацыі „ТОДТ”, тэкстыльных фабрыкаў, млыноў і г.д. Апрача таго, выкарыстоўваючы веданне нямецкай мовы, „заходнюю” культуру і „культурніцкія” манеры, а потым і асабістыя сувязі з немцамі, палякі ўпарта абаранялі свае пазіцыі, каб з іх дапамогай змагацца з беларусамі, якіх прадстаўлялі як сімпатыкаў савецкай улады і партызанскага руху. Белапольская тактыка вызначалася разлікам выкарыстаць нямецкі апарат дзеля знішчэння, перадусім, прагрэсіўнай беларускай інтэлігенцыі і свядомых беларускіх сялянаў”[35].

Антыпольская акцыя, якая ажыццяўлялася пры ангажаванні беларускіх дзеячаў, мела месца на Слонімшчыне. На момант пачатку антыпольскай акцыі справа выглядала наступным чынам. Тутэйшая адміністрацыя, у тым ліку біржа працы, лясніцтва і паліцыя, была практычна цалкам абсаджаная палякамі альбо сімпатыкамі польскага руху. У прыватнасці, пасаду бурмістра Слоніма займаў ксёндз Грахольскі, тым часам як паліцыю ачоліў Рымша. Акурат апошні, выкарыстоўваючы сваё становішча, набіраў на службу ў мясцовыя пастарункі выключна асобаў польскай нацыянальнасці. Пры гэтым з дазволу нямецкіх уладаў Рымша распачаў выяўленне і арышты прыхільнікаў беларускага руху, якія абвінавачва-

[33] Studium Polski Podziemnej (далей: SPP), sygn.: MSW – Pro Memoria, k. 35.
[34] Archiwum Akt Nowych (далей: AAN), sygn.: 202-III-124, k. 14.
[35] *Памяць. Навагрудскі раён*, Мінск 1996, с. 311.

ліся ў антынямецкіх настроях і камуністычнай дзейнасці[36]. Дайшло да таго, што на будынку гарадской паліцыі быў змешчаны надпіс на польскай мове: Straż Obywatelska[37].

Сітуацыя пачала змяняцца з другой паловы 1941 г. з прызначэннем новага фэльдкаменданта маёра Кіцына, які ажыццявіў рэарганізацыю мясцовай улады, ангажуючы ў яе як мага больш беларусаў па нацыянальнасці. У сваёй антыпольскай акцыі нямецкія ўлады абапіраліся на мясцовых беларускіх актывістаў, якіх нярэдка выкарыстоўвалі ў якасці дэнунцыятараў. Варта тут заўважыць, што сваімі антыпольскімі поглядамі на Слонімшчыне вылучыўся кіраўнік мясцовай гарадской арганізацыі БНС Рыгор Зыбайла[38], які ў студзені 1942 г. накіраваў на імя кіраўніцтва БНС у Менску нататку „Стасунак палякаў і іх зарганізаванасць", у якой акцэнтаваў увагу на засілле польскім элементам мясцовай адміністрацыі ў горадзе і павеце. Уважаючы, што гэтага будзе недастаткова, 10 лютага 1942 г. кіраўнік Слонімскай БНС скіраваў „Памятную нататку" падобнага зместу на імя гэбітскамісара Слонімскай акругі, у якой, не шкадуючы тагачаснага афіцыйнага пафасу і агідных словаў, пісаў, між іншым: „Польская нацыянальная меншасць з усёй моцы сваімі акцыямі перашкаджае збліжэнню нямецкіх уладаў і нямецкага народу з беларускім народам. Захапіўшы ўсе пасады ў цывільных і гарадскіх дзяржаўных установах, на прадпрыемствах і сельскагаспадарчых прадпыемствах, палякі праводзяць прыхаваны сабатаж. Яны праводзяць шкодную дзяржаве прапаганду супраць нямецкага народа і тэрарызуюць беларускае насельніцтва раёна, пагражаючы ім адраджэннем «польскай дзяржавы» на нашай Бацькаўш-

[36] Д. Крывашэй, *Польская супольнасць Беларусі пад час акупацыі*, с. 143.

[37] С. Хмара, *Пад гітляроўцамі*, „Беларускі Голас" (Таронта) 1969, 23 верасня.

[38] Рыгор Зыбайла нарадзіўся ў 1913 г. у в. Ёлкі Івацэвіцкага раёну. У верасні 1939 г. у якасці падафіцэра Войска Польскага ўдзельнічаў у вераснёвай кампаніі. Потым трапіў у нямецкі палон, адкуль уцёк. Падчас пераходу нямецка-савецкай мяжы быў затрыманы савецкімі памежнікамі. У жніўні 1940 г. падчас знаходжання ў вязніцы ў Берасці быў завербаваны НКУС з мэтай распрацоўкі асяроддзя беларускіх нацыяналістаў і дзейнічаў у якасці канфідэнта пад псеўданімам «Ёлкін». З надыходам нямецкай акупацыі займаў адказныя пасады ў БНС і БКА. Сябра нелегальнай Беларускай незалежніцкай партыі (БНП). Сцверджана, што падчас яго знаходжання на акупаванай гітлераўцамі тэрыторыі Зыбайла належыў да агентаў гестапа. Праўдападобна, у часе нямецкай акупацыі ён часова страціў сувязь з савецкімі службамі дзяржбяспекі і не з'яўляўся падвойным агентам. 1 чэрвеня 1946 г. ён быў затрыманы аддзелам СМЕРШа 3-й Арміі ў Берліне. 21 сакавіка 1947 г. Зыбайла быў асуджаны па артыкуле № 64 Крымінальга кодэксу БССР Ваенным трыбуналам Міністэрства ўнутраных справаў Гарадзенскай вобласці да 10 гадоў зняволення. AIPN, sygn.: sygn.: BU, 00231/228, t. 14.

чыне пасля «паразы» Нямецкага Рэйху. (...) Польская акцыя скіраваная не толькі супраць нас, але ў асаблівасці супраць нашага хаўрусніка — нямецкага народу, супраць вялікай барацьбы за Новую Еўропу”[39]. У дакуменце Зыбайла адкрыта называў прозвішчы асобаў польскай нацыянальнасці, якія працавалі ў паліцыі, гарадской управе, у галіне адукацыі і школьніцтва, на тартаку, і патрабаваў зняць іх з займаных пасадаў. На думку кіраўніка БНС, чыстка школьніцтва і дзіцячых прытулкаў акругі была неабходная дзеля таго, каб пазбегнуць паланізацыі маладых беларусаў[40]. У справаздачы Слонімскай БНС ейны кіраўнік пісаў: „Толькі рашучая чыстка адміністрацыйных устаноў ад польскіх элемэнтаў можа ўстрымаць раз’юшаную беспакараннем польскую шавіністычную прапаганду супроць Нямецкага і Беларускага народаў і польскі тэрор”[41].

„Памятная нататка” Р. Зыбайлы мела свае наступствы. Згодна са звесткамі слонімскага гэбітскамісара, за перыяд з канца 1941 па лета 1944 г. у акрузе было звольнена з працы і заменена беларусамі каля 1 тысячы палякаў[42]. Зыбайла аднак не абмяжоўваўся толькі пісьмовымі дэкларацыямі ў Цэнтралю БНС і да нямецкіх уладаў. Як узгадваў у сваіх успамінах сучаснік тых падзеяў Сяргей Хмара, старшыня БНС асабіста браў актыўны ўдзел у арыштах польскай інтэлігенцыі ў Слоніме і ваколіцах, накіроўваючы супрацоўнікаў СД па адрасах ахвяраў. Масавыя арышты ў Слоніме адбыліся 29 чэрвеня 1942 г., у выніку чаго ў мясцовай вязніцы апынулася каля 120 асобаў. Вядома таксама, што каля 90 арыштаваных палякаў было вывезена за горад і расстраляна 19 снежня 1942 г. Сярод ахвяраў былі суддзя, лекары, павятовыя і гмінныя чыноўнікі, манашкі, інжынеры, леснікі. У ліку замардаваных знаходзіліся дзеці да 8 гадоў. Рэшта арыштаваных была закатавана ў Калдычаўскім лагеры[43]. У размовах са сваімі паплечнікамі па беларускай дзейнасці Зыбайла сцвярджаў, што ўдзельнічаў у арыштах без уласнай ініцыятывы, а пад націскам Баранавіцкага гестапа[44]. Аднак, як сведчаць лісты Р. Зыбайлы да гэбітскамісара Слонімскай акругі, мясцовы кіраўнік БНС быў не толькі пасіўным саўдзельнікам масавых арыштаў польскай інтэлігенцыі, але і адным з непасрэдных ініцыятараў. Р. Зыбайла не толькі паказваў месцы жыхарства ахвяраў, якія падлягалі рэпрэсіям, але, таксама, рыхтаваў гэныя спісы і тым самым аб-

[39] НАРБ, ф. 384, воп. 1, спр. 34, л. 7-9.
[40] НАРБ, ф. 384, воп. 1, спр. 34, л.1-3.
[41] НАРБ, ф. 384, воп. 1, спр. 34, л. 12-14
[42] НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 1043, л. 431.
[43] A. Galiński, *Eksterminacja inteligencji polskiej latem 1942 r. ...*, s. 188, 192-193.
[44] С. Хмара, *Пад гітляроўцамі,* „Беларускі Голас” (Таронта) 1969, 23 верасня.

легчваў працу карнай экспедыцыі супрацоўнікаў Баранавіцкага СД[45].

Апрача даносаў кіраўніка Слонімскай БНС да гэбітскамісара, несумнеўна да арыштаў тутэйшых палякаў спрычыніліся іншыя беларускія нацыяналісты, якія прагнулі ліквідацыі польскіх уплываў. У жніўні 1942 г. у „Беларускай газэце" выйшаў артыкул „Слонімшчына за апошняе чвэрцьвечча (Да гісторыі нацыянальна-вызвольнага змагання беларусаў Слонімскай акругі)", у якім колькасць палякаў акрэслівалася на 5-6 тыс. чалавек. Аўтар падзяляў іх на дзьве групы: мясцовыя і наплывовыя з цэнтральнай Польшчы. Пры гэтым першыя трактаваліся як „рэнегаты-беларусы", рэпрэзентаваныя абшарнікамі і шляхтай, якія абвінавачваліся ў ліквідацыі беларускага жыцця[46].

Аднак нават пасля карэнных зменаў польскія ўплывы не перасталі існаваць у акрузе. Працяглы час у Слоніме дзейнічаў Беларускі нацыянальны камітэт, на чале якога стаялі сімпатыкі польскага падполля[47].

Не менш драматычна разгортваліся падзеі ў Баранавіцкай акрузе. З прыходам немцаў мясцовая адміністрацыя і паліцыя былі абсаджаныя амаль выключна палякамі. Зрэшты, гэта прызнаюць як інфарматары польскай канспірацыі, так і гавораць крыніцы савецкіх партызанаў[48]. Як узгадваў па вайне былы начальнік паліцыі ў Нясвіжы Уладзімер Сенька, „сітуацыя была такая (...) пасты дапамаговай паліцыі ў польскіх руках, асабліва ў Нясвіжы (...) палякам была нагода распраўляцца з беларускім свядомым элементам пад выглядам барацьбы з камуністамі. (...) Бурмістрам быў былы польскі чыноўнік Тэлюк. Ён наладзіў польскую адміністрацыю з самых шавіністаў, якія займаліся вышукваннем патэнцыяльных праціўнікаў паланізацыі і эвентуальна тых, якія змаглі б наладзіць адміністрацыю і школьніцтва ў беларускім напрамку"[49]. Паводле мfroкаванняў тагачаснага кіраўніка Нясвіжскай павятовай паліцыі У. Сенькі ў выніку акцыі „вылоўлівання" камуністаў у Нясвіжскім павеце было расстраляна не менш як 65 асобаў і прыблізна 15 — у Клецкім. У Стоўбцах па даносах было арыштавана 19 беларусаў, у тым ліку такі вядомы нацыянальны дзеяч, як былы пасол Сойму 2-й Рэчы Паспалітай Юры Сабалеўскі. Сітуацыя на карысць беларусаў пачала змяняцца ўжо з восені 1941 г., калі ў сярэдзіне верасня на пасадзе бурмістра паляк Тэлюк быў зменены беларусам, а з лі-

[45] НАРБ, ф. 384, воп. 1, спр. 34, л.7-9.

[46] Д. Крывашэй, *Польская супольнасць Беларусі пад час акупацыі*, с. 143.

[47] НАРБ, ф. 384, воп. 1, спр. 34, л. 1-3; С. Хмара, *Пад гітляроўцамі*, „Беларускі Голас" (Таронта), 1969, 23 верасня.

[48] НАРБ, ф. 4п, воп. 33а, спр. 166, л. 7.

[49] Ю. Весялкоўскі, *Што прывяло Армію Краёву на Беларусь*, Лондан 1995, с. 109.

стапада пачаўся павольны працэс „беларусізацыі” паліцыі. На пасаду кіраўніка нясвіжскай паліцыі ў гэты час быў накіраваны беларус У. Сенька, які правёў неадкладную чыстку шэрагаў павятовай паліцыі парадку ад асобаў польскай нацыянальнасці[50]. З гэтага моманту рэпрэсіўная машына пачала працаваць супраць польскага насельніцтва.

У Баранавіцкай акрузе ролю дэнунцыятара супраць польскай інтэлігенцыі выконваў Уладзімір Бядрыцкі, кіраўнік мясцовага аддзела прапаганды. У сваёй нататцы да гэбітскамісара ён пісаў, „што да варожага нам лагеру — польскай нацыяналістычнай інтэлігенцыі, то нягледзячы на Катынскія падзеі і Ваш публічны зварот да палякаў 1 траўня, ніякіх зменаў у лепшы бок не адбылося. Група польскіх нацыяналістаў у Баранавічах на чале з лекарамі Дэрасетам, Васілеўскім, Ляскоўскім і іншымі, упарта працягвае займацца сваёй варожай дзейнасцю, распаўсюджваючы сярод насельніцтва разнастайныя чуткі, скіраваныя супраць існуючага парадку, шырока выкарыстоўваючы ў сваёй варожай працы прафесійныя магчымасці лекараў. Я не маю сумневу, што на тэрыторыі гебіта і найверагодней у Баранавічах, ужо даўно існуе польскі нелегальны цэнтр і дзякуючы таму, што на чале яго стаяць разумныя, хцівыя людзі, якія валодаюць метадам барацьбы нашых карных органаў, гэта арганізацыя дасюль не выкрытая. Той факт, што ў Івянецкім і Стаўбцоўскім паветах з’явіліся польскія партызанскія аддзелы ў польскай форме і што яны складаюцца з палякаў — былых польскіх афіцэраў, падафіцэраў і асаднікаў і нават былых валасных старастаў (стараста Старыжскай воласці Стаўбцоўскага павету) гавораць пра тое, што гэтыя аддзелы самі па сабе не ўзніклі, без каардынацыйнага цэнтра”[51]. Неўзабаве пасля атрымання гэбітскамісарам гэтага ліста ў перыяд 26-30 чэрвеня 1942 г. у Баранавічах і павеце адбыўся шэраг арыштаў польскай інтэлігенцыі. У выніку акцыі ў вязніцы апынулася каля 1 000 палякаў — уладальнікаў і адміністратараў маёнткаў, настаўнікаў, ксяндзоў, з якіх цягам наступных дзён за хабары было вызвалена толькі каля 20 асобаў. Рэшта была расстраляна 13 ліпеня 1942 г. падчас масавай экзекуцыі на праваслаўных могілках у Баранавічах[52]. Як сцвярджаюць відавочцы ваенных падзеяў, масавыя арышты палякаў у акрузе мелі месца нават увесну 1944 г., калі антыпольская акцыя была згорнутая. Напры-

[50] Там жа, с. 110.
[51] НАРБ, ф. 370, воп. 6, спр. 48, л. 3-4.
[52] A. Galiński, *Eksterminacja inteligencji polskiej latem 1942 r. ...*, s. 189; Z. Boradyn, *Niemen rzeka niezgody...*, s. 32-33.

канцы сакавіка 1944 г. у Клецку і Нясвіжы былі арыштаваныя ўсе маладыя палякі, у тым ліку дзяўчаты, якія былі вывезеныя ў Калдычаўскі лагер, дзе наступіла экзекуцыя[53].

Увагі заслугоўвае факт, што ў большасці выпадкаў справамі арыштаваных у Баранавіцкім, Слонімскім і Наваградскім паветах займаліся следчыя Баранавіцкага СД, куды транспартаваліся вязні. Вядома, што на момант антыпольскіх рэпрэсіяў у Баранавіцкім СД акрамя немцаў працавалі ў якасці следчых людзі іншых нацыянальнасцяў (беларусы, расейцы, украінцы, палякі), а менавіта — Аляксандр Русак, Вацлаў Папуцэвіч, Лелюк, Салавей, Дыячэнка, Прачкоўскі, Лявіцкі, Уладзімір Клім, Пяцюшкевіч, Суслімаў, Арэншкевіч, Кендзёра, Вайтэнка, Аскалдовіч, Хэц, Тулейка, Саўка, Барбарыч, Міхалоўскі, Юзаф Гурневіч, Юры Дабралоўскі і інш. Вышэйзгаданыя функцыянеры бралі ўдзел у допытах і катаваннях арыштаваных. Варта заўважыць, што яшчэ ў 1946 г. польская падпольная арганізацыя „Вольнасць і Незалежнасць" (ВіН) мела гэты спіс і вышуквала на тэрыторыі Польшчы былых супрацоўнікаў Баранавіцкага СД за ўдзел у судовых злачынствах, здзейсненыя супраць палякаў падчас нямецкай акупацыі[54].

У выніку ўзаемных дэнунцыяцыяў ахвярамі нацыстоўскага тэрору сталіся сотні нявінных людзей. Масавыя арышты палякаў мелі месца ў Наваградку, Лідзе, Слоніме, Дзярэчыне, Нясвіжы, Баранавічах і інш. Як вынікае з апошніх даследаванняў, толькі ўлетку 1942 г. на Наваградчыне было замардавана не менш 680 асобаў польскай нацыянальнасці, у тым ліку: у Наваградку — 63, Лідзе — 14, Слоніме — 90, Дзярэчыне — 8, Нясвіжы — 72, Баранавічах — 400, Калдычаве — 33. На даны момант удалося аднак вызначыць прозвішчы звыш 200 прадстаўнікоў польскай інтэлігенцыі, якія былі замардаваныя ў гады нямецкай акупацыі на Наваградчыне[55].

У часе нялюдскай дэнунцыяцыі нярэдка ахвярамі рабіліся нават аднадумцы. Істотным момантам даносаў падчас нямецкай акупацыі была матывацыя. Акрамя вышэйзгаданых імкненняў беларускіх нацыяналістаў такім чынам зліквідаваць польскія ўплывы не ў меншай ступені, відаць, выступалі асабістыя парахункі. Так, досыць частымі былі выпадкі, калі сябры БНС уносілі ў спісы „палітычна небяспечных" сваіх уласных нядобразычліўцаў. У такіх выпадках палітычныя абвінавачванні стваралі толькі агульны фон і праформу дзеля нагоды да знішчэння свайго ворага. Яскрава свед-

[53] Д. Крывашэй, *Польская супольнасць Беларусі пад час акупацыі*, с. 147.
[54] AIPN, sygn.: WiN, t. 106, k. 1.
[55] A. Galiński, *Eksterminacja inteligencji polskiej latem 1942 r. ...*, s. 190.

чыць пра гэта факт, што ў лік рэпрэсаваных траплялі асобы, якія не мелі нічога на сумленні ў дачыненні да нямецкіх уладаў і не былі заангажаваныя ў палітычную альбо культурніцкую дзейнасць. Іх віна палягала на тым, што яны, як вопытныя прафесіяналы, атрымалі працу ў цывільных органах улады і такім чынам перашкаджалі будаванню кар'еры сваіх нядобразычліўцаў[56]. Як сцвярджаў пасля вайны адзін з беларускіх дзеячаў пад нямецкай акупацыяй Язэп Малецкі, супрацоўнікі Вілейскага СД Канстанцін Касяк і яго брат Іван Касяк з Мінска сваімі бесперапыннымі даносамі перадавалі ў СД цэлыя спісы свядомых беларусаў-каталікоў, якіх выдавалі за „схаваных палякаў" і гэтым самым спрычыняліся да іх пагібелі ў нямецкіх катоўнях[57]. Гэты факт пацвярджаюць і архіўныя дакументы. Пэўную дыскрымінацыю і недавер у адносінах да каталікоў, якія падавалі беларускую нацыянальнасць, магчыма прасачыць на прыкладзе спісу валасных старастаў Маладзечанскага раёну[58].

Разглядаючы антыпольскую акцыю ў Генеральнай акрузе „Беларусь" нельга абмінуць увагай непасрэдных выканаўцаў арыштаў і экзекуцыяў. У дакументах польскай канспірацыі ёсць згадкі, што „беларускія паліцыянты праяўляюць фанатычныя настроі нянавісці да палякаў"[59]. Немагчыма аднак да канца падзяліць гэта меркаванне. Па-першае, на час масавых арыштаў у беларускай паліцыі служыла значная частка палякаў, якія былі вымушаныя ўдзельнічаць у рэпрэсіях супраць суродзічаў. Па-другое, з аналізу следчых і судовых справаў шэрагу паліцыянтаў, якія бралі ўдзел у вынішчэннях польскага насельніцтва на Наваградчыне, вынікае, што ў пераважнай большасці гэта былі людзі без выразна акрэсленых нацыянальных альбо палітычных арыентацыяў. Памылкова было б называць іх беларускімі нацыяналістамі, якія забівалі сваіх суайчыннікаў па нацыянальнай альбо палітычнай прыкмеце. Толькі ў адным выпадку аўтар сустрэў згадку адносна выразна антыпольскіх настрояў паліцыянта з Нясвіжа. Гэты выпадак датычыцца Аляксандра Сенькі, які публічна падкрэсліваў сваю нянавісць да палякаў. У астатніх выпадках гаворка ідзе наконт прадстаўнікоў сялянскай моладзі, якія альбо праз прымусовы заклік, альбо па прычыне надзеі на паляпшэнне матэрыяльнага дабрабыту ў якасці добраахвотнікаў трапілі на службу ў паліцыйныя органы. Заслугоўвае

[56] AAN, sygn.: 202-III-203, k. 49-50.
[57] Я. Малецкі, *Пад знакам Пагоні*, Таронта 1976, с. 130.
[58] Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (далей: ДАМВ), ф. 1039, воп. 1, спр. 28, л. 148-151.
[59] AAN, sygn.: 203-III-56, k. 65.

ўвагі матывацыя былога жаўнера 13-га паліцыйнага батальёна СС пры СД і вартаўніка Калдычаўскага лагеру Віктара Вяроніка, які сцвярджаў, што ўступіў у паліцыю, каб „помсціць бальшавікам за Катынь". Гэта аднак не перашкодзіла яму ўдзельнічаць у арыштах і экзекуцыях асобаў, звязаных з польскім падполлем. Следчыя дакументы 1950-х гг. у ПНР прамаўляюць на карысць таго, што былыя паліцыянты бралі ўдзел у злачынствах супраць асобаў розных нацыянальнасцяў[60].

Нельга аднак адмаўляць наяўнасці антыпольскіх рысаў у некаторых прадстаўнікоў каманднага складу, якія актыўна ангажаваліся ў палітычную дзейнасць і былі шчыльна звязаныя з рознымі беларускімі і нямецкімі арганізацыямі (БНС, СД). Яскравым прыкладам можа паслужыць выпадак, які адбыўся падчас перамоваў на Наваградчыне паміж аддзелам Арміі Краёвай і прадстаўнікамі Беларускага наваградскага швадрону (кіраўнік дэлегацыі Уладзімір Сіўко) у сакавіку 1944 г. Акурат беларускі бок, выставіўшы свае ўмовы, пагражаў, што ў разе адмовы АК пакінуць тэрыторыю на левым баку ад Нёмана, яны распачнуць тэрор і сістэматычную акцыю вынішчэння польскага насельніцтва ў Наваградскай акрузе[61].

Нягледзячы на антыпольскі тэрор, удалося часткова ліквідаваць польскі ўплыў і апанаваць уладу на месцах толькі ў Баранавіцкай, Вілейскай, Наваградскай і Слонімскай акругах, дзе дамінавала праваслаўнае насельніцтва. Да пачатку 1942 г. усе раённыя бурмістры польскай нацыянальнасці былі зменены беларусамі, якія былі абавязаны ачысціць ад палякаў апарат кіравання. Не атрымалася ажыццявіць адпаведную замену ў лясной гаспадарцы і кіраванні маёнткаў, дзе катастрафічна бракавала спецыялістаў-беларусаў. Беларускія нацыяналісты вінавацілі ў сваіх паразах палякаў, аднак павольная беларусізацыя краю тлумачылася не толькі супрацівам з боку польскіх чыннікаў. У рэчаіснасці беларускім нацыяналістам крытычна бракавала прафесійных кадраў, якія маглі паўнавартасна заняць месца звольненых палякаў. Гэта вынікае бадай з усіх справаздачаў раённых і акруговых кіраўнікоў БНС. Больш таго, лозунгі беларускага руху не карысталіся шырокай падтрымкай сярод беларускіх сялянскіх масаў. Як канстатаваў камандзір Наваградскай акругі АК падпалкоўнік Януш Праўдзіц-Шляскі, галоўным хаўруснікам польскага падполля ў барацьбе з БНС было беларускае сялянсва, якое не адзывалася на заклікі беларускіх нацыяналістаў. Аб

[60] Archiwum Głównej Komisji Badania Zbrodni Hitlerowskich w Polsce (далей: AGKBZHwP), sygn.: SWWr 98, 103-112; SOWr 67.

[61] *Беларуска-польскія перамовы ў сакавіку 1944 г.*, „Беларускі Рэзыстанс" 2005, № 2, с. 104.

непрыхільным стаўленні беларускага насельніцтва Наваградчыны да дзейнасці БНС сведчаць таксама ўспаміны шэфа штаба акругі капітана Станіслава Сэндзяка.

На 1943 г. прыхільнікам БНС удалося дамагчыся падпарадкавання пэўнай часткі павятовых і валасных управаў, школаў. Так, да 1943 г. вага беларусаў у адміністрацыйным апараце павялічылася да 80%. Нярэдка аднак замена палякаў беларусамі на пасадах у гмінных і павятовых управах адбывалася за кошт элементарнага перапісвання нацыянальнасці. Каб захаваць пасаду, некаторыя беларусы і палякі ў асабовых дакументах адважваліся на змену нацыянальнасці. Дзякуючы архіўным дакументам магчыма прывесці некалькі прыкладаў такога кшталту. Увагі заслугоўвае выпадак, які меў месца ў Клецкім раёне, дзе на 24 кастрычніка 1941 г. пасады сельскіх старастаў займалі 78 беларусаў і 22 палякі[62]. У сваю чаргу справа наконт валасных старастаў выглядала інакш: 7 беларусаў і 8 палякаў[63]. У ліку апошніх знаходзіўся староста Шчапіцкай воласці Антон Твардоўскі. 12 студзеня 1942 г. ён звярнуўся ў раённую ўправу з наступным лістом: „Прашу перапісаць мяне ў пашпарце нацыянальнасць з паляка на беларуса, паколькі я ёсць беларусам і на Беларусі нарадзіўся, дзяды і бацькі мае былі праваслаўнымі. І я ахрышчаны ў Клецкай Пятроўскай царкве, пры гэтым далучаю сваю метрычную запісь, а калі я жаніўся і браў палячку, то яна не хацела ісці за мяне замуж і я змушаны быў стаць каталіком. Я ёсць каталік, а нацыянальнасць мая беларус і лічу сябе беларусам і хачу быць беларусам, прашу перапісаць мяне на беларуса”[64].

На тэрыторыі, дзе важкую ролю на выкрышталізаванне пачуцця нацыянальнай самасвядомасці аказвала веравызнанне, у перыяд антыпольскай акцыі часамі нават прыналежнасць да каталіцтва магла выклікаць падазронасць у польскай нацыянальнасці альбо сімпатыі да польскага руху. Нядзіўна, што падчас складання рэестраў валасных старастаў насупраць прозвішчаў нават каталікоў-беларусаў магчыма было сустрэць запіс: „Не выключна, што звязаны з таемнай польскай арганізацыяй”[65]. Нярэдка фармальнасць перапісвання палякаў на беларусаў сапраўды была выразна заўважнай. У справаздачы БНС па Вілейскай акрузе за кастрычнік 1942 г. адзначалася наступнае: „У акрузе недахоп ідэйна-нацыянальнай інтэлігенцыі. (...) Да таго ж ёсць чужая інтэлігенцыя, каторая стаіць на кіроўных пасадах, але замест таго, каб дапамагаць нам у працы,

[62] ДАМВ, ф.1039, воп. 1, спр. 35.
[63] ДАМВ, ф. 1541, воп. 1, спр. 1, л. 26.
[64] ДАМВ, ф. 1538, воп. 1, спр. 51, л 93-94.
[65] ДАМВ, ф. 1039, воп. 1, спр. 28, л. 148-151.

толькі перашкаджае. Як прыклад магу падаць Мядзельскі раён, дзе старшыня павету выразна сімпатызуе польскай інтэлігенцыі. Няслушна ён зрабіў, што сваіх урадаўцаў-палякаў перапісаў беларусамі, якія нічога супольнага не маюць з беларускай нацыяй. Сведчыць пра гэта школьны інспектар у Мядзелі. Беларускае друкаванае слова не пашыраецца, а ўсё толькі ў польскай мове. Урадаўцы пішуць і размаўляюць па-польску. Цяжка будзе спадзявацца ад іх развіцця беларускай культуры і выхавання насельніцтва ў духу нацыянальным беларускім”[66].

Аднак змена нацыянальнасці была ўласціва не толькі тым, хто займаў пэўныя пасады ў мясцовым адміністрацыйным апараце дзеля захавання сваёй кар'еры. Многія простыя сяляне з мэтай адвесці ад сябе ўвагу паліцыі ва ўмовах антыпольскай акцыі вырашаліся змяніць нацыянальнасць. Вядома, што ў Слонімскай і Баранавіцкай акругах сотні людзей звярталіся да мясцовых функцыянераў з просьбамі аб змене нацыянальнасці. Вельмі зручным момантам ажыццяўлення адпаведнай папраўкі быў час пашпартызацыі. У большасці выпадкаў людзі пацвярджалі сваё паходжанне тым, што „дзяды і бацькі нарадзіліся на Беларусі і ўвесь час пражывалі тут”. Дзеля прыкладу належыць прывесці фрагмент аднаго з лістоў, які пісаў Міхал Лабан з Клецкага раёна: „У 1941 годзе, калі я вырабіў сабе пашпарт, мне памылкова запісалі польскую нацыянальнасць, відаць таму, што я прадставіў метрыку каталіцкага веравызнання, якую я меў з 1927 году. А фактычна да 1927 г. мае бацькі былі праваслаўнымі і карэннымі беларусамі”[67]. У асобных выпадках да просьбаў далучаліся водпісы царкоўных альбо касцельных метрыкаў, а таксама польскія пашпарты, выдадзеныя яшчэ ў 20-30-я гады. Так, Адам Шчалкевіч з Клецка ў звароце да начальніка раёна пісаў: „У сувязі з выданнем пашпартоў пры савецкай уладзе жыхарам каталіцкага веравызнання ўпісвалі польскую нацыянальнасць, я таксама атрымаў пашпарт з польскай нацыянальнасцю, нягледзячы на тое, што мой бацька і я нарадзіліся і пражывалі да 1919 году ў Слуцкім павеце”[68].

З аналізу тэкстаў просьбаў у справе нацыянальнасці вынікае, што большасць патрабуючых зменаў мела нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці, як беларускай, так і польскай, якія выключна ў залежнасці ад палітычных абставінаў падавалі прыналежнасць да рознай нацыянальнасці. Магчыма прывесці тут фрагмент ліста жыхара Клецка Аляксандра Карчэўскага, у якім чытаем: „У час рабення

[66] НАРБ, ф. 384, воп. 1, спр. 38, л. 31.
[67] ДАМВ, ф. 1538, воп. 1, спр. 51, л. 203.
[68] ДАМВ, ф. 1538, воп. 1, спр. 51, л. 119.

пашпарту па маёй віне мяне і маю жонку запісалі па нацыянальнасці палякамі. Я прынамсі дасюль не адрозніваю нацыянальнасці ад рэлігіі, але мае бацькі нарадзіліся ў маёнтку Ясенцы Кругавіцкай воласці. А мая маці Карчэўская Ганна нарадзілася ў вёсцы Галавачы ў сялянскай сям'і Алясевіча Давыда па нацыянальнасці праваслаўнага. Мы з жонкай у хаце нават польскай гаворкі не ведаем. А запісаныя палякамі па нацыянальнасці, таму прашу выправіць гэтую памылку і выдаць мне і маёй жонцы пасведчанне, што мы беларусы, а не палякі, бо мае дзяды і бацькі нарадзіліся на нашай роднай Беларусі”[69].

У адрозненні ад цывільнай мясцовай адміністрацыі, дзе беларускім нацыяналістам атрымалася дасягнуць пэўных поспехаў, інакш справа выглядала ў дачыненні да паліцыі, дзе асобы беларускай нацыянальнасці на той час складалі толькі 60%. Не ўдалося беларускім дзеячам канчаткова пазбавіцца ад польскага элементу і ў пазнейшы перыяд. У прыватнасці, на снежань 1943 г. у паліцыі Берасцейскай акругі палякі налічвалі 22%. Тым часам у паліцыі парадку Баранавіцкай акругі вага палякаў складала 21,2%, беларусаў — 77,6%. Найбольш неспрыяльная для беларусаў сітуацыя існавала ў Лідскай акрузе, дзе традыцыйна польскія ўплывы былі найбольш моцныя. Заслугоўвае ўвагі выпадак, які меў месца падчас інспекцыі лідскай паліцыі шэфам беларускай паліцыі Францам Кушалем, які пазней узгадваў: „Яшчэ перад зборам паліцыянтаў начальнік акруговай паліцыі прасіў мяне гаварыць так, каб не паглыбляць існаваўшы польска-беларускі антаганізм. Калі паліцыянты былі пашыхтаваныя, то я сказаў, каб усе беларусы паднялі рукі (...) аказалася, што іх было ня больш 20%, рэшта былі палякамі”. Дарэчы, нават на красавік 1944 г. у Лідскай акрузе на 25 камендантаў паліцыі даводзіўся 21 паляк, а 2/3 асабовага складу паліцыйных гарнізонаў, таксама, складалі палякі. Да больш інтэнсіўнай ліквідацыі польскіх уплываў у паліцыйных структурах дайшло ў жніўні 1943 г., калі прадстаўнікі беларускай адміністрацыі прынялі рашэнне „пра ачыстку шэрагаў беларускай паліцыі ад палякаў”. Далей у гэтым распараджэнні гаварылася: „Усе без вынятку асобы польскай нацыянальнасці, якія знаходзяцца на службе ў паліцыі, павінны быць звольненыя”[70]. Кіраўнік прапагандысцкага апарату ў Баранавічах Ул. Бядрыцкі звяртаў увагу на патрэбу сталых чыстак сярод беларускай паліцыі павету ад ненадзейнага элементу, прапану-

[69] ДАМВ, ф. 1541, воп. 1, спр. 1, л. 120.

[70] А. Гелагаеў, *Беларускія нацыянальныя вайсковыя фармацыі ў часе Другой сусьветнай вайны*, Мінск 2002, с. 19.

ючы замест палякаў і спаланізаваных беларусаў набіраць у паліцыю маладых беларускіх настаўнікаў і сябраў Саюза беларускай моладзі[71].

Як паказваў паслядоўны досвед, беларускія нацыянальныя лозунгі не знаходзілі ў паліцыі прыдатнай глебы, паколькі ў шэрагах паліцыі бадай да канца нямецкай акупацыі знаходзілася шмат агентаў АК. Сведчаннем гэтага з'яўляецца факт, што ў часе ўзброеных сутыкненняў беларускай паліцыі з польскімі партызанамі досыць часта здараліся выпадкі запланаванага свядомага пераходу першых на бок апошніх. Як адзначалася раней, практычна анічога не здолелі беларускія нацыяналісты змяніць на сваю карысць на Лідчыне і Віленшчыне. Так, польская канспірацыйная сетка ахоплівала амаль усе пастарункі на згаданай тэрыторыі, а найперш у Кабыльніку, Мядзелі, Дунілавічах, Жодзішках, Варапаеве, Паставах і г.д.[72] Групай канспіратараў у паліцыі ў Жодзішках кіраваў Антон Палеўскі „Паль", у Мядзелі — былы звязовы 23-га ўланскага палка Антон Кільчэўскі, у Новай Мышы — Генрык Запруцкі і г.д. Тыповы выпадак адбыўся ў Шчучынскім раёне, дзе ў снежні 1942 г. шчучынскі школьны інспектарат скардзіўся ў Мінск, што начальнік мясцовай паліцыі паляк Галомбэк самавольна арыштаваў па абвінавачванні ў камунізме і расстраляў беларускага настаўніка Навагрудскай школы Андрэя Душа, які быў зацятым патрыётам. У сувязі з гэтым школьны інспектарат прасіў прыслаць новага начальніка паліцыі, беларуса па нацыянальнасці, які б бараніў правы суайчыннікаў[73].

Беларускія нацыяналісты супольна з немцамі прымянялі розныя формы і метады, каб па магчымасці абмежаваць удзел палякаў у паліцыі і вайскова-паліцыйных фармаваннях. Вельмі пільную селекцыю ў нацыянальным сэнсе праходзілі кандыдаты ў 13-ы беларускі батальён СС пры СД, які лічыўся найбольш баяздольным фармаваннем вайскова-паліцыйнага кшталту. Гэтая адзінка выкарыстоўвалася ў часе антыпартызанскіх акцыяў, а таксама ў выпадках правядзення „зондэракцыяў", у тым ліку пацыфікацыяў гетаў на абшары Генеральнай акругі „Беларусь". 7-я рота батальёна выконвала вартавую службу ў сумна вядомым Калдычаўскім лагеры, дзе ўтрымлівалася насельніцтва, западозранае ў сувязі з польскім і савецкім рухам супраціву. Аднак нават гэтае фармаванне не было пазбаўленае знаходжання ў сваіх шэрагах удзельнікаў АК. Як прыклад

[71] Б. К'яры, *Штодзённасць за лініяй фронту. Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941-1944 г.)*, с. 179, 187-188.

[72] Z. Grut-Mejer, *Partyzancka Brygada „Kmicica". Wileńszczyzna 1943*, Bydgosz 1997, s. 44.

[73] НАРБ, ф. 392, воп. 1, спр. 200, л. 61-62.

магчыма прывесці выпадак з выкрыцём і арыштам у 1943 г. паліцыянта Яна Сухажэўскага, які ачольваў канспірацыйную польскую ячэйку ў Калдычаве[74].

З мэтай фармавання беларускага аблічча паліцыі ў 1943 г. пачаўся выдавацца часопіс „Беларус на варце”, на бачынах якога сустракаліся досыць крытычныя матэрылы. Рэдакцыя не магла заплюшчыць вочы на значны ўплыў польскіх настрояў сярод асабовага складу паліцыйных камандаў. У адным з артыкулаў чытаем: „У Заходняй Беларусі паліцыянты задавалі манеры польскай паліцыі. У часе службы яны ўжываюць польскую мову, на народ глядзяць як на нейкіх халуёў. (...) Вось чаму шампалы і бізуны паліцыі (...) нярэдка сякуць беларускія спіны”[75].

Прынцып недапушчання палякаў дзейнічаў таксама і падчас стварэння беларускіх вайсковых фармаванняў пад нямецкай камандай. У прыватнасці, 23 лютага 1944 г. генеральны камісар Беларусі Курт фон Готберг выдаў загад аб сфармаванні Беларускай краёвай абароны (БКА), мабілізацыі ў якую падлягалі мужчыны 1908-1924 гадоў нараджэння. БКА мелася быць выкарыстана ў барацьбе з савецкай партызанкай і Чырвонай Арміяй. Да чэрвеня 1944 г. паўстала 39 пяхотных і 6 сапёрных батальёнаў агульнай колькасцю да 25 тыс. чалавек. Згодна з загадам камандзіра БКА маёра Ф. Кушаля за № 15 ад 15 сакавіка 1944 г. належыла „ўсунуць (звольніць — Ю. Г.) з батальёнаў усіх афіцэраў і падафіцэраў-палякаў, перадаўшы іх да дыспазіцыі Біржы працы. Тое самае зрабіць і з палякамі-стральцамі, калі, паводле поглядаў камандзіраў ротаў, іх знаходжанне ў шэрагах БКА з'яўляецца непажаданым”[76]. У некаторых батальёнах гэты загад быў выкананы літаральна, у выніку з вайсковых шэрагаў былі дэмабілізаваныя ўсе жаўнеры польскай нацыянальнасці[77]. У іншых — мабілізаваныя палякі (нават афіцэры і падафіцэры, як напрыклад, у Клецкім батальёне) працягвалі надалей знаходзіцца ў шэрагах. Катэгарычна забаранялася набіраць палякаў, таксама, на 4-тыднёвы афіцэрскі курс БКА, які адбываўся ў Менску. У адпаведнасці з загадам камандзіра БКА за № 22 ад 30 траўня 1944 г. асабоваму складу забаранялася спяваць небеларускія шыхтовыя песні, у тым ліку — польскія[78].

У часе ажыццяўлення мабілізацыі ў БКА польская канспірацыя заняла пазіцыю закіду сваіх агентаў у шэрагі гэтага фармавання

[74] AGKBZHwP, sygn.: SWWr 98, 105, k. 83.

[75] „Беларус на варце” 1943, № 1, с. 12.

[76] НАРБ, ф.382, воп. 1, спр. 14, л. 27.

[77] ДАМВ, ф. 1039, воп. 1, спр. 167, л. 7, 15; Я. Малецкі, *Пад знакам Пагоні*, с. 135.

[78] НАРБ, ф. 382, воп. 1, спр. 14, л. 39.

з мэтай іх паслядоўнага раскладання альбо пераводу на свой бок. У шэрагу выпадкаў гэты крок аказаўся ўдалым. У Баранавіцкім батальёне БКА апынулася ажно 80 сябраў АК, у тым ліку паручнік „Віктар", які абняў камандаванне адной з ротаў. У выніку ў красавіку 1944 г. дайшло да спробы вывесці асабовы склад батальёну ў лес з мэтай яго далейшага выкарыстання ў аперацыйнай дзейнасці. Заданне па рэалізацыі змовы было ўскладзена на каменданта раёну „Гарадзішча" сяржанта У. Трыфанава. Аднак не дайшло да выканання акцыі.

Канспірацыйнай сеткай Арміі Краёвай была ахоплена не толькі беларуская паліцыя і цывільная адміністрацыя. Яскрава сведчыць пра гэта выпадак пераходу на бок польскіх партызанаў каля 40 вучняў Наваградскай беларускай гімназіі, за кошт якой папаўняўся асабовы склад СБМ, Наваградскага беларускага швадрону і беларускага настаўніцтва. Усе ўцекачы былі залічаныя ў 8-ы батальён 77-га палка „Багданка" Згрупавання панямонскіх партызанскіх батальёнаў АК. Акрамя таго, у часе ўцёку да партызанаў былі затрыманы яшчэ 12 вучняў, якіх немцам дапамог выкрыць канфідэнт-беларус[79].

Антыпольскія рэпрэсіі пачалі згортвацца з другой паловы 1943 г. На гэта паўплываў шэраг чыннікаў. Па-першае, у верасні 1943 г. у выніку замаху савецкіх падпольшчыкаў загінуў генеральны камісар Беларусі В. Кубэ, які ў сваёй палітыцы рабіў стаўку на беларускі нацыянальны рух і быў прыхільнікам ліквідацыі польскіх уплываў. Па-другое, нямецкія акупацыйныя ўлады вырашылі выкарыстаць польскае падполле ў змаганні з савецкімі партызанамі. З гэтага моманту пачынаюцца спробы завязання лучнасці паміж паасобнымі фармаваннямі АК і нямецкімі ўладамі. Адпаведна, адной з умоваў часовага перамір'я мусіла стаць спыненне рэпрэсіяў у дачыненні да польскага насельніцтва. Па-трэцяе, у хуткім часе пасля ажыццяўлення „Polenaktion" нямецкія ўлады зарыентаваліся, што выкараненне польскага элементу ў розных сферах грамадскага і гаспадарчага жыцця мае значныя мінусы для акупантаў. Змена палякаў беларусамі адмоўна адбілася на прафесійнай кваліфікацыі ўстановаў. Як вынікае са справаздачы обэрштурмбанфюрэра СС д-ра Штраўха ад 10 красавіка 1943 г., нягледзячы на тое, што палякаў не належыла прымаць на адказныя пасады ў сілавых структурах па прычыне палітычнай ненадзейнасці, бо сярод іх было шмат сімпатыкаў канспірацыі, аднак сярод беларусаў быў надта нізкі адсотак

[79] T. Drobniak, *8 batalion 77 pp AK „Bohdanka" Zgrupowania Nadniemańskich Batalionów Partyzanckich*, „Wojskowy Przegląd Historyczny" 1991, nr 1, s. 84.

асобаў, якія з-за нізкага ўзроўню адукацыі не адпавядалі для працы ў СД альбо крымінальнай паліцыі[80]. У прыватнасці, у выніку замены палякаў беларусамі ў гаспадарчых установах значна знізіліся адпаведныя паказчыкі вытворчасці. Як паведамляў гэбітскамісар Вілейскай акругі да пачатку 1943 г. прадуктыўнасць спала на 75%. На яго думку, працяг антыпольскай акцыі мог бы мець разбуральныя вынікі для Генеральнай акругі „Беларусь"[81].

Трэба адзначыць, што і з боку беларускага нацыянальнага руху стаўленне да палякаў паступова злагоджвалася. 21 снежня 1943 г. у Мінску была створана Беларуская Цэнтральная Рада (БЦР) на чале з Радаславам Астроўскім, якая мела выконваць ролю беларускага ўраду пад нямецкай апекай. Рэзалюцыя II Усебеларускага Кангрэсу, які адбыўся 27 чэрвеня 1944 г. у Менску, хоць і абвяшчала несапраўднымі ў вачах беларусаў усе дамовы з удзелам Польшчы і „так званага эміграцыйнага ўраду Польшчы", якія тычыліся беларускіх земляў, больш не мела аніводнага антыпольскага выразу, тым часам як дэкларавала антысавецкую накіраванасць[82]. Варта тут прыгадаць, што сам Астроўскі цягам 1942-1945 гг. неаднаразова рабіў спробы наладзіць сувязь з прадстаўнікамі польскай канспірацыі, каб праз іх усталяваць адносіны з польскім эміграцыйным урадам і распачаць перамовы наконт далейшага беларуска-польскага супрацоўніцтва[83]. Як адзначала выведка Арміі Краёвай у 1944 г., „стаўленне беларусаў да палякаў наогул аб'ектыўнае. Беларуская прэса друкуе артыкулы на польскую тэматыку, аднак яны справядліва апісваюць крыўды, якія чыніліся з боку палякаў. У прамовах Астроўскага, акрамя засцярогаў перад ашуканскай для беларусаў польскай прапагандай, адсутнічаюць якія-колечы выступы супраць Польшчы"[84].

Да ліку аднаго з найбольш спрэчных пытанняў у гісторыі беларуска-польскіх стасункаў у перыяд нямецкай акупацыі належыць тэрор польскага падполля ў дачыненні да беларусаў. Дасюль у асяроддзі беларускіх гісторыкаў існуе меркаванне, што АК мэтанакіравана выкарыстоўвала гвалт адносна цывільнага беларускага насельніцтва. Пры гэтым па дадзенаму пытанні супадаюць погляды беларускіх гісторыкаў, якія належаць да цалкам супрацьлеглых гра-

[80] НАРБ, ф. 370, воп. 1, спр. 1267, л. 303а.

[81] НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 974, л. 155.

[82] *Другі Ўсебеларускі Кангрэс. Матар'ялы сабраныя і апрацаваныя на падставе пратакольных запісаў камісіяй Беларускай Цэнтральнай Рады пад рэдакцыяй праф. Р. Астроўскага*, Мюнхен 1954, с. 67.

[83] H. Piskunowicz, *Polskie podziemie a kwestia białoruska w latach 1941-1944*, s. 56.

[84] AAN, sygn.: 202-III-127, k. 36.

мадска-палітычных плыняў. Так, у беларускай савецкай гістарыяграфіі жаўнеры Арміі Краёвай прадстаўляліся як „банды", якія, побач з гітлераўцамі, свядома рабавалі і вынішчалі нявіннае беларускае насельніцтва. Яшчэ ў перыяд нямецкай акупацыі пры Беларускім штабе партызанскага руху (БШПР) дзейнічалі камісіі, якія займаліся зборам фактаў „аб злачынствах, здзейсненых белапольскімі бандамі над мірнымі жыхарамі". Згодна з данымі камісій, толькі за перыяд сакавік-красавік 1944 г. на тэрыторыі Жалудоцкага, Шчучынскага і Васілішскага раёнаў было налічана 19 здарэнняў з забойствамі і рабункамі сялянаў з боку „белапольскіх бандаў"[85]. Аднак ужо сам стыль і тэрміналогія дакумента выклікае сумнеў адносна аб'ектыўнасці зместу. Рэч у тым, што вышэйзгаданыя камісіі былі створаны па загаду „зверху" і мелі на мэце як мага больш дыскрэдытаваць і запляміць польскую партызанку. Гэтае стаўленне было абумоўленае агульнай пазіцыяй савецкіх уладаў да АК і ейнай дзейнасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Перакананне аб варожым стаўленні партызанаў АК да беларускага насельніцтва наўпрост успадкаемнічала таксама і большасць сучасных беларускіх гісторыкаў, якія займаліся пытаннямі польскага падполля на тэрыторыі Беларусі. Закіды і абвінавачванні Арміі Краёвай у антыбеларускім тэрорах ўтрымліваюць працы беларускіх эмігрантаў.

Трэба зазначыць, што дадзенае пытанне патрабуе больш глыбокага і дэталёвага даследавання. Як падаваў камандзір Навагрудскай акругі АК падпалкоўнік Януш Праўдзіц-Шляскі, за перыяд нямецкай акупацыі экзекутыва выканала 300 смяротных выракаў у дачыненні да „здраднікаў". Акрамя таго, яшчэ 80 асобаў, якія супрацоўнічалі з камуністамі, былі выдадзеныя ў рукі нямецкіх уладаў[86]. Згодна са звесткамі беларускіх крыніцаў перыяду Другой сусветнай вайны, цягам 1942-1944 гг. толькі на Лідчыне ад рук польскага падполля загінула 1 200 беларусаў. На бачынах газеты „Беларускі Голас", якая выдавалася ў акупаванай немцамі Вільні, быў змешчаны спіс 93 асобаў[87]. На падставе параўнаўчага аналізу гэных даных са звесткамі, якія ўтрымліваюць савецкія крыніцы, аўтар знайшоў пацвярджэнне ў адносінах да 2/3 згаданага спісу. Гэта дазваляе сцвярджаць, што гаворка ідзе наконт некалькіх сотняў замардаваных асобаў.

На жаль, адсутнасць адпаведных архіўных крыніцаў не дазваляе прааналізаваць ахвяраў на акалічнасць нацыянальнага складу і абставінаў смерці. Разам з тым, як вынікае з даных савецкіх партыза-

[85] НАРБ, ф. 1399, воп. 1, спр. 25, л. 1-11

[86] J. Prawdzic-Szlaski, *Nowogródczyzna w walce 1940-1945,* Londyn 1976, s. 93.

[87] „Беларускі Голас", 1944, № 10-13.

наў, амаль у кожным з выпадкаў гаворка ідзе пра беларусаў[88]. Магчыма таксама зрабіць гэта на прыкладзе Лідскага павету, на які прыпадае ільвіная доля выракаў, выкананых АК. Паводле рэдакцыі „Беларускага Голаса”, гэтыя людзі не былі актыўна заангажаваныя ў палітычную дзейнасць, тым часам як прычынай іх скону сталася тое, што „Бог пусціў іх на свет беларусамі і яны з часам маглі стацца дзейнымі беларусамі”[89]. Значную частку ахвяраў складалі сяляне, якія, на думку рэдакцыі „Беларускага Голасу”, „былі спакойныя, працавітыя і (...) пасіўныя беларускія сяляне”[90]. Архіўныя дакументы аднак дазваляюць больш дэталёва высветліць прычыны, па якіх гэтыя людзі сталіся аб’ектам тэрору з боку польскага падполля. З аналізу прозвішчаў і асабовых даных шэрагу ахвяраў вынікае, што сярод іх сустракаліся як беларусы, гэтак і палякі, у роўнай ступені — праваслаўныя і каталікі. Гэты факт аўтаматычна выключае сцвярджэнне, што тэрор адбываўся на падставе нацыянальнасці альбо веравызнання. Як сведчаць архіўныя даныя (савецкія), не менш паловы ў той ці іншай ступені мела дачыненне да савецкай улады. У прыватнасці, сярод замардаваных досыць значны адсотак складалі асобы, якія ўтрымлівалі сталыя кантакты з савецкай канспірацыяй (сувязныя, інфарматары, партызаны) і праводзілі дзейнасць на карысць савецкіх партызанаў. Пэўную частку складалі былыя савецкія функцыянеры, якія ў перыяд 1939-1941 гг. у якасці партыйных альбо дзяржаўных супрацоўнікаў (міліцыянты, старшыні калгасаў альбо сельскіх саветаў) бралі актыўны ўдзел ва ўмацаванні савецкай улады, а нярэдка ангажаваліся ў антыпольскую акцыю. Згодна з падлікамі савецкіх функцыянераў, толькі на тэрыторыі чатырох (Балічынскі, Раканчыцкі, Ражанскі, Сароцкі) з пятнаццаці сельсаветаў паваеннага Шчучынскага раёну загінула не менш 40 жыхароў, якія мелі сувязь з партызанамі[91]. Падобным чынам справа выглядала на тэрыторыі іншых рэгіёнаў Лідскай акругі — у Жалудоцкім і Васілішкаўскім раёнах, дзе крыніцы савецкіх партызанаў занатоўвалі акты гвалту акоўцаў супраць „былых савецкіх службоўцаў”[92]. У дакументах савецкіх партызанаў магчыма адшукаць непацверджаныя даныя, што толькі цягам са студзеня па сакавік 1944 г. на Лідчыне жаўнерамі АК было знішчана да 450

[88] НАРБ, ф. 4п, воп. 33а, спр. 466, л. 97.
[89] „Беларускі Голас”, 1944, № 13.
[90] Там жа, 1944, № 12.
[91] Спіс забітых т.зв. белымі польскімі партызанамі ў наднёманскіх сельсаветах: Балічынскім, Раканчыцкім, Сароцкім і Ражанскім (склаў Віктар Ярмалковіч), копія ў архіве аўтара.
[92] НАРБ, ф. 1399, воп. 1, спр. 25, л. 1-11.

асобаў з ліку партыйна-савецкага актыву, партызанаў і іх сімпатыкаў[93].

З натуральных прычынаў людзі гэткага кшталту ў вачах польскага падполля выглядалі ў якасці ідэалагічных і палітычных ворагаў, што пераносіць акты тэрору ў дачыненні да іх з боку АК з катэгорыі беспадстаўнага сістэматычнага мардавання нявінных людзей у катэгорыю ўчынкаў палітычнай барацьбы. Іншая рэч, што многія з „былых савецкіх функцыянераў" пайшлі ў свой час на супрацоўніцтва з савецкімі ўладамі ў розных акалічнасцях, якія часам не мелі нічога супольнага з антыпольскай чыннасцю. Але вайна ёсць вайна і, на жаль, ейная сутнасць не падпарадкоўваецца законам людскасці і нармальнасці.

Разглядаючы прычыны актаў тэрору ўдзельнікаў польскага падполля ў дачыненні да беларускіх сялянаў нельга аднак абсалютна ўсё спісваць на ліквідацыю савецкіх сімпатыкаў. Акрамя палітычных матываў тэрору (ліквідацыя пранямецкіх і прасавецкіх элементаў) нельга выключаць і іншых прычынаў, якія маглі мець месца з боку жаўнераў АК. Як згадвалася вышэй, камандзір Наваградскай акругі АК падпалкоўнік Я. Праўдзіц-Шляскі падае, што ў дачыненні да здраднікаў было выканана 300 смяротных выракаў. Аднак толькі на прыкладзе адной Лідчыны бачна, што лічба ахвяраў ахоплівае больш значную колькасць асобаў. З гэтага вынікае, што некаторыя забойствы адбываліся без ведама камандавання, таму іх нельга інкрымінаваць польскай канспірацыі. У гэтым выпадку належыць браць пад увагу такі чыннік, як уласная помста, карані якой маглі сягаць яшчэ міжваеннага перыяду. У разе актаў асабістай помсты палітычныя погляды, нацыянальнасць альбо веравызнанне не адыгрывала ніякай ролі, а асноўным матывам выступалі прыватныя парахункі, якія выводзіліся з даваеннага перыяду. Яскрава сведчыць пра гэта шэраг фактаў, калі ахвяры былі забітыя ў надзвычай жахлівых акалічнасцях, якім спадарожнічалі катаванні і здзекі. У такіх выпадках складана меркаваць, што каты не мелі анічога асабістага да сваіх ахвяраў.

Нярэдка мелі месца выпадкі помсты, якія паходзілі з вераснёўскіх падзеяў 1939 г. Як вядома, частка насельніцтва паўночна-ўсходніх земляў 2-й Рэчы Паспалітай (галоўным чынам, малазямельныя і беззямельныя сяляне) станоўча ўспрыняла ўступленне Чырвонай Арміі. Здаралася, што з гэтай нагоды даходзіла да спатыканняў з хлебам і соллю, а таксама будавання ўрачыстых трыумфальных арак у вёсках і мястэчках. З такім захаваннем адной часткі польскіх грамадзянаў кантраставала стаўленне іншай, якая ў найболь-

[93] НАРБ, ф. 4п, воп. 29, спр. 812а, л. 3.

шай ступені зведала потым жудасныя рэпрэсіі савецкага рэжыму ў 1939-1941 гг. Нацыянальную афарбоўку гэтай з'яве надаваў факт, што на ўсходніх тэрыторыях міжваеннай Польшчы сацыяльныя падзелы ў значнай ступені накладаліся на этнічныя. Беларуская меншасць акурат была рэпрэзентаваная ў сваёй большасці ніжэйшымі слаямі. Да гэтага варта дадаць, што на хвалі агульнага хаосу ў верасні 1939 г. здараліся выпадкі мардаванняў і крывавых распраў асаднікаў і абшарнікаў з боку бандаў „люмпенаў". Пасля ўсталявання савецкай улады на былых польскіх тэрыторыях удзельнікі гэных бандаў здолелі зрабіць службовую кар'еру, уступіўшы ў міліцыю альбо актыўна ангажуючыся ў органы мясцовай улады[94].

Не выключна, таксама, што былыя ворагі-суседзі маглі зводзіць свае прыватныя парахункі і антаганізмы, якія выводзіліся яшчэ з даваеннага часу. У вайну дзеля помсты склаліся надта выгодныя варункі, калі асноўным прыкрыццём для даносу рабіліся абвінавачванні ў сувязі з камуністамі і прасавецкіх поглядах сваіх нядобразычліўцаў.

Магчыма прывесці шмат прыкладаў, калі ў першыя дні нямецкай акупацыі адбылася хваля самасудаў, арыштаў па даносах і экзекуцыяў над асобамі, якія здзейснілі цяжкія злачынствы супраць жыхароў Заходняй Беларусі ў верасні 1939 г. Да ліку падобных прыкладаў належыць выпадак, які меў месца ў ліпені 1941 г. у мястэчку Антопаль, дзе мясцовыя паліцыянты ўчынілі экзекуцыю над Савам Дранюком. У верасні 1939 г. ён быў на чале банды, якая ў момант безуладдзя на тамтэйшым абшары бязлітасна замардавала звыш 300 польскіх вайскоўцаў і асаднікаў[95]. У гэтым выпадку магчыма казаць пра ўчынкі справядлівасці, якія, праўда, былі выкананы ў складаных ваенных варунках.

Акрамя таго, нельга абмінаць увагай тую акалічнасць, што частку замардаваных складалі выпадковыя ахвяры польска-савецкай партызанскай вайны, якая распалілася на Наваградчыне ў 1943-1944 гг. У гэтым разе загінуўшыя маглі быць аб'ектам звычайнай помсты за забойствы палякаў, паколькі ёсць мноства прыкладаў тэрору савецкіх партызанаў у адносінах да сімпатыкаў і сваякоў удзельнікаў АК. У асобных выпадках людзі рабіліся закладнікамі абставінаў. Так, напрыклад, селянін з-пад Васілішкаў Панкевіч стаўся ахвярай забойства па прычыне, што ведаў асабіста выканаўцаў замаху на мясцо-

[94] Шырэй: M. Wierzbicki, *Polacy i Białorusini w zaborze sowieckim. Stosunki polsko-białoruskie na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej pod okupacją sowiecką*, Warszawa 2000.

[95] Н. Марчук, *Трагедия, поросшая кустарником,* „Народная воля" 2005, 28 ліпеня.

вых настаўніц і меў магчымасць агучыць іх прозвішчы[96].

Трэба аднак падкрэсліць, што ў ліку замардаваных, побач з савецкімі сімпатыкамі і ахвярамі асабістых парахункаў, асобную групу складаюць удзельнікі беларускага нацыянальнага руху, якія супрацоўнічалі з нямецкімі ўладамі. Як сцвярджаюць некаторыя ўдзельнікі беларускага руху і сучаснікі ваенных падзеяў, толькі на тэрыторыі Васілішкаў і Шчучына прадстаўнікі гэтай групы складалі не менш 47 чалавек, у тым ліку 6 настаўнікаў, 10 супрацоўнікаў валасных і павятовых управаў, 2 школьныя інспектары, святар з жонкаю, 2 паліцыянты, 8 чальцоў БНС і 17 сялянаў[97]. З аналізу спісу памардаваных, які быў апублікаваны ў „Беларускім Голасе", вынікае, што вышэйпададзеныя лічбы выглядаюць цалкам праўдападобна. Так, з 93 прозвішчаў, змешчаных у выданні, 35 складаюць асобы, у рознай ступені заангажаваныя ў беларускія калабаранцкія арганізацыі і мясцовую адміністрацыю, створаную пад нямецкім кантролем (валасныя старасты і іншыя чыноўнікі ніжэйшага ўзроўню, паліцыянты, сябры БНС). Трэба адзначыць, што ў лік забітых польскім падполлем трапілі асобы, якія займалі досыць адказныя пасады, як Юльян Лапуць — сакратар школьнага інспектарату ў Жалудку, Пратасевіч і Длужнеўскі — старасты Юрацішскага павету, Мікалай Сямашка — камендант паліцыі ў Юрацішках, Юстын Халявінскі — валасны старшыня БНС[98], Пятро Рандзевіч і Францішак Валасюк — старшыні БНС у Шчучыне, Сяргей Тэхць — старшыня БНС у Жалудку, Павел Шляхтун — школьны інспектар у Васілішках, Аляксей Станкевіч — школьны інспектар у Лідзе, Мінкевіч — бурмістр Ліды і інш.[99] Да ліку найбольш гучных замахаў, весткі пра якія знайшлі шырокі водгук у тагачаснай беларускай прэсе, належаць забойства 13 чэрвеня 1943 г. у Васілішках Юльяна Саковіча і Леаніда Маракова, а таксама замах 14 жніўня 1943 г. на намесніка гэбітскамісара Лідскай акругі Ільлю Кіслага, які быў застрэлены ў Лідзе. Выканаўцамі першага выраку былі жаўнеры з патрульнага аддзелу 301, другога — 4-асобовы патруль асяродку „Бор". Страты беларускага руху былі настолькі адчувальнымі, што яго дзеячы ўздымалі алярм перад нямецкімі ўладамі. Адной са спробаў звярнуць увагу на становішча на Лідчыне быў артыкул Янкі Станкевіча „Палажэнне ў Лідскай акрузе Генеральна-

[96] W. Jermołkowicz, *Powiat Szczuczyński w czasie okupacji niemieckiej 1941-1944* (kopia rękopisu w posiadaniu autora).

[97] Ю. Весялкоўскі, *Што прывяло Армію Краёву на Беларусь*, с. 112.

[98] „Беларускі Голас", 1944, № 12.

[99] *Лёс аднаго пакалення (Успаміны). Кастусь Сідаровіч, Юстын Пракаповіч, Янка Жамойцін, Віктар Ярмалковіч*, Беласток 1996, с. 74.

га камісарыяту Беларусі”, які так і не быў змешчаны ў газеце „Беларускі Голас” (Вільня) па прычыне страху рэдакцыі перад магчымымі рэпрэсіямі[100].

Актыўнасць польскага падполля на Лідчыне давала свой вынік у ліквідаванні беларускіх уплываў. Кволая і без гэтага мясцовая беларуская нацыянальная актыўнасць паступова згортвалася. Гэта было ўласціва як для адміністрацыйнага апарату, так і ў галіне школьніцтва. Увесну 1943 г. быў зачынены Дом беларускай культуры ў Шчучыне. Да вясны 1944 г. скончыла сваю працу Шчучынская настаўніцкая семінарыя. Многія беларускія актывісты былі вымушаныя ратавацца ўцёкамі ў іншыя акругі альбо нават на тэрыторыю Генеральнага Губернатарства[101].

Нярэдка сярод беларускіх нацыяналістаў, замардаваных АК, трапляліся асобы не столькі заангажаваныя ў палітычную дзейнасць, колькі культурніцка-асветныя дзеячы. Пераважна гэта датычылася вясковых і местачковых настаўнікаў, якія актыўна працавалі на ніве беларускага школьніцтва. Ва ўмовах акцыі беларусізацыі Праваслаўнай царквы ў поле зроку экзекутывы траплялі таксама святары, якія падтрымлівалі ідэі аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы, абвешчанай у Менску падчас нямецкай акупацыі. У выніку ахвярамі ўзаемнага тэрору рабіліся святары і манахі. У вачах польскага руху праваслаўны клір, які сімпатызаваў палітыцы акупантаў у галіне царквы з натуральных прычынаў трактаваўся як ідэалагічны вораг. Гэта пытанне патрабуе дэталёвага даследавання. Аднак з ужо маючыхся крыніц магчыма адрадзіць імёны некалькіх праваслаўных святароў, якія былі замардаваныя польскім падполлем за ўдзел у беларускай дзейнасці альбо за сувязь з савецкімі партызанамі. Напрыклад, польскі пісьменнік Юзаф Мацкевіч узгадвае наступныя ахвяры — а. Іван Аляхновіч з вёскі Турэйск на Шчучыншчыне (забіты разам з жонкай), а. Канстанцін Маеўскі, а. Анатоль Кірык з Трокаў, а. Міхаіл Леванчук (разам з жонкай) і іераманах Лукаш з Крэва[102].

У сваю чаргу каталіцкія святары, якія досыць часта былі заангажаваныя ў польскім падполлі, рабіліся аб’ектам гітлераўскіх арыштаў і экзекуцыяў, да якіх нярэдка мелі непасрэднае дачыненне беларускія нацыяналісты. Яскравым прыкладам гэтага можа паслужыць арышт і расстрэл манашак у Наваградку. На думку польскага боку, да экзекуцыі наваградскіх назаратанак у значнай ступені спрычыніліся мясцовыя беларускія калабарацыяністы, якія сваімі даносамі ў гестапа нацкоўвалі акупантаў на манахаў, выстаўляючы апошніх у якасці прыхаванага асяродку польскага супраціву. У рэчаіснасці не з’яўлялася таямніцай, што манахі сімпатызавалі поль-

скай партызанцы і былі своесаблівым стрыжнем духовай падтрымкі. Некаторыя ангажаваліся ў працу падпольных польскіх школаў на Наваградчыне. Вядома, што па зразумелых прычынах гэтага не маглі трываць беларускія нацыяналісты[103]. Варта тут прыгадаць, што адной з мэтаў беларускага руху ў дачыненні да Каталіцкага касцёла была яго беларусізацыя праз увядзенне беларускай мовы ў набажэнствах, што магчыма было дасягнуць у выніку чысткі польскіх уплываў. Выглядала гэта практычна немагчыма па прычыне, што Рыма-каталіцкі касцёл быў адной з асноўных фартэцыяў польскасці на ўсходніх крэсах. У сувязі з гэтым у вачах беларускіх дзеячаў каталіцкі клір выглядаў як распаўсюджвальнік пальшчызны ў касцёле, а таксама маральны стрыжань натхнення і падтрымання польскага супраціву[104].

Разам з тым, немагчыма шукаць у канфлікце выразна акрэсленых рэлігійных учынкаў, паколькі сярод прадстаўнікоў беларускага лагеру значны адсотак складалі асобы каталіцкага веравызнання.

Падчас беларуска-польскага канфлікту не адбылося без узброеных сутыкненняў паміж вайсковымі фармаваннямі абодвух бакоў. Найчасцей даводзіцца весці гаворку пра акцыі польскіх партызанаў па знішчэнню і раззбраенню пастарункаў альбо цэлых гарнізонаў беларускай паліцыі. З польскіх крыніц вынікае, што толькі партызаны Віленскай акругі АК за перыяд сваёй дзейнасці правялі 12 баёў і ўзброеных сутыкненняў з аддзеламі беларускай паліцыі. Да найбольш удалых атакаў жаўнераў Віленскай акругі Арміі Краёвай належыць залічыць раззбраенне паліцыйных пастарункаў у Жодзішках (15.08.1943) і Кабыльніку (06.1943). Тым часам, партызаны Наваградчыны таксама практыкавалі раззбраенне пастарункаў беларускай паліцыі, у тым ліку — у Івянцы (06.1943), Старыне і Кіслухах (28.06.1943), Дзераўной і Волме (30.06.1943), Засуллі і Рубяжэвічах (03.07.1943) і г.д. Зазвычай раззбраенню паліцыйных пастарункаў спадарожнічалі выкананні смяротных выракаў. У часе акцыі па захопу пастарунка ў Кабыльніку быў пакараны смерцю тамтэйшы паліцыйны камендант-беларус, якому інкрымінаваўся ўдзел у забойствах палякаў. Дарэчы, выканаўцам гэтай акцыі быў аддзел брыгады „Кміціца", які ў значнай ступені складаўся з былых паліцыянтаў з Мядзеля, перайшоўшых напярэдадні на бок поль-

[100] „Летапіс жыцця беларускай эміграцыі", 1985, № 28, с. 87-92.

[101] W. Jermołkowicz, *Powiat Szczuczyński w czasie okupacji niemieckiej 1941-1944* (kopia rękopisu w posiadaniu autora).

[102] Ю. Весялкоўскі, *Што прывяло Армію Краёву на Беларусь*, с. 114.

[103] A. Zienkiewicz, *Ofiara przyjęta...*, s. 21-22.

[104] AAN, sygn.: 202-III-203, k. 52-53.

скіх партызанаў. Тым часам падчас нападу і раззбраення паліцыі ў Жодзішках быў забіты мясцовы камендант Віктар Каркоз, кіраўнік раённай арганізацыі БНС Аляксандр Сівец, яго намеснік Франц Цялкоўскі, а таксама рэлігійны дзеяч Тамаш Трызна[105]. Нагадаем, што ўсе гэтыя мерапрыемствы былі рэалізаваныя дзякуючы пранікненню ў шэрагі беларускай паліцыі законспіраваных удзельнікаў польскага падполля. Неўзабаве пасля раззбраення значная іх частка легалізавалася і ўступіла ў палявыя аддзелы. У прыватнасці, у чэрвені 1943 г. у лес пайшла 22-асабовая грамада законспіраваных акоўцаў, якія дасюль служылі ў беларускай паліцыі ў Мядзелі на чале з Антонам Кільчэўскім, былым звязовым 23-га уланскага палка Войска Польскага[106]. Пасля акцыі ў Жодзішках брыгада „Кміціца" папоўнілася за кошт 20 былых беларускіх паліцыянтаў.

Не заўсёды аднак польскім партызанам спадарожнічаў поспех. Бясспрэчна, да ліку адной з найбольш няўдалых акцыяў магчыма аднесці спробу 8-га батальёна 77-га палка АК „Багданка" авалодаць мястэчкам Усялюб і знішчыць тамтэйшы гарнізон нямецкай жандармерыі, беларускай паліцыі і аддзелу Наваградскага беларускага швадрону (г.зв. „рагулеўцаў"), якая адбылася 7 чэрвеня 1944 г. Не разлічыўшы ўласныя сілы, нападаючы бок натрапіў на нечаканы і надзвычай упарты супраціў паліцыянтаў. У рэшце рэшт акоўцы былі вымушаныя адысці, нясучы значныя страты забітымі і параненымі. У выніку няўдалай акцыі загінуў камандзір батальёну паручнік Уладыслаў Масакоўскі „Ястшэмбец", які, не жадаючы здавацца ў палон, скончыў жыццё самагубствам[107]. 26 ліпеня 1943 г. каля вёскі Міколцы адбылося ўзброенае сутыкненне паміж партызанамі „Кміціца" і беларускай паліцыяй, якое трагічна скончылася для першых. Партызаны страцілі забітымі двух жаўнераў і былі вымушаныя беспаспяхова адысці[108].

Здаралася аднак, калі бакам атрымоўвалася дамовіцца і пазбегнуць братазабойчага і непатрэбнага праліцця крыві. У прыватнасці, падобны факт меў месца на Наваградчыне ў сакавіку 1944 г., калі аддзел Арміі Краёвай заняў мястэчка Бярозаўка. Неўзабаве, мясцовасць была акружаная Наваградскім беларускім швадронам пад камандаваннем Барыса Рагулі. У выніку бакам удалося дасягнуць згоду без бою. Польскія партызаны добраахвотна пакінулі мясцовасць у абмен на гарантыю беларусаў не тэ-

105 А. Калодка, *Напад напякаў на Жодзішкі,* „Зважай", лістапад 1979, с. 4.

106 Z. M. Grut-Mejer, *Partyzancka Brygada „Kmicica". Wileńszczyzna 1943,* Bydgoszcz 1997, s. 67.

107 T. Drobniak, *8 batalion 77 pp AK „Bohdanka"...*, s. 85.

108 Z. M. Grut-Mejer, *Partyzancka Brygada „Kmicica"...*, s. 76.

рарызаваць польскае насельніцтва на правым беразе Нёмана[109].

Такім чынам, магчыма зрабіць выснову, што ў часе нямецкага панавання на акупаваных тэрыторыях дайшло да праяваў грамадзянскай вайны.

У перыяд нямецкай акупацыі на былых паўночна-ўсходніх землях 2-й Рэчы Паспалітай назіраўся канфлікт паміж прыхільнікамі беларускага нацыянальнага руху і змагарамі за вяртанне польскай дзяржаўнасці. Нямецкая акупацыйная ўлада ў якасці аднаго са сродкаў апанавання акупаванай супольнасці разглядала абвастрэнне нацыянальных антаганізмаў. Польскі рух уяўляў для акупантаў паважную небяспеку на заплеччы гітлераўскіх войскаў. Увесну 1942 г. у Берліне нямецкі апарат дзяржбяспекі ўсвядоміў пагрозу для сябе з боку набіраючага моц польскага руху супраціву на тэрыторыі Генеральнай Губерні. Назіранні за ўсходнімі тэрыторыямі пераконвалі, што сітуацыя там, таксама, ішла ў кірунку ўзмацнення польскіх уплываў, што выяўлялася ў высокім адсотку польскага элементу ў мясцовай адміністрацыі. З мэтай яго ўтаймавання і аслаблення была распачата „польская акцыя", якая палягала на ачышчэнні органаў мясцовай улады ад палякаў, фізічным знішчэнні польскай інтэлігенцыі. У ліпені 1942 г. было абвешчана, што Рыма-каталіцкі касцёл на тамтэйшых абшарах ёсць адной з асноўных фартэцыяў польскага руху. І гэты аргумент даваў немцам падставы для рэпрэсіяў супраць духавенства[110].

Трэба адзначыць, што ў былых паўночна-ўсходніх ваяводствах 2-й Рэчы Паспалітай патэнцыял дзеля польска-беларускіх нацыянальных антаганізмаў быў невысокі. Рэпрэзентантамі антыпольскіх поглядаў былі ў асноўным беларускія нацыяналісты, пазіцыя якіх з гледзішча гістарычнага аналізу ёсць цалкам зразумелая. Беларускія дзеячы, расчараваўшыся ў палітыцы польскай і савецкай уладаў у адносінах да Беларусі, зрабілі стаўку на Нямеччыну з надзеяй на адраджэнне пры ейнай дапамозе беларускай дзяржаўнасці. Малады беларускі нацыяналізм, дзеячы якога ў свой час перажылі роспач ад супрацоўніцтва з Польшчай і СССР, зараз усклалі свае надзеі на Нямеччыну і ў момант яе пераможнага маршу былі мала схільнымі да кампрамісаў з палякамі. Такія погляды шмат у чым небеспадстаўна вынікалі з недалёкабачнай нацыянальнай палітыкі даваеннай Польшчы, якая была скіраваная на су-

[109] *Беларуска-польскія перамовы ў сакавіку 1944 г.*, „Беларускі Рэзыстанс" 2005, nr 2, c. 98-105.

[110] M. Ruchniewicz, *Stosunki narodowościowe w latach 1938-1948 na obszarze tzw. Zachodniej Białorusi*, s. 287.

цэльную паланізацыю меншасцяў[111]. Сярод беларускага лагеру было не багата адданых прыхільнікаў нацыянал-сацыялізму, аднак шмат тых, хто намагаўся выкарыстаць зручны момант сусветнага катаклізму, якім з'яўлялася Другая сусветная вайна, каб у выніку дамагчыся незалежнай беларускай дзяржавы. На карысць апошняга прамаўляе факт, што на працягу акупацыі адразу некалькі палітычных груповак беларускіх нацыяналістаў, якія калабаравалі з немцамі, нелегальна наладзілі лучнасць з прадстаўнікамі польскага падполля з прапановамі аб пошуках шляхоў да супрацоўніцтва. Антыпольскія настроі нацыяналістаў былі адразу заўважаныя акупантамі, якія імкнуліся выкарыстаць іх у ажыццяўленні „Polenaktion". У сваю чаргу беларускія дзеячы намагаліся выкарыстаць антыпольскую нямецкую палітыку ў змаганні за палітычную вагу на акупаванай тэрыторыі і выціснуць польскі элемент з палітычнага і грамадска-эканамічнага жыцця, інтарэсы якога супярэчылі імкненням першых. У часе антыпольскай акцыі яны сталіся толькі звычайным інструментам дзеля ажыццяўлення злачынных планаў, якія былі адным з учынкаў нацыстоўскай нацыянальнай палітыкі.

З іншага боку, існавалі прыхільнікі адраджэння Польшчы ў межах 1939 г., якія не дапушчалі думкі наконт стварэння на ўсходніх тэрыторыях даваеннай Польшчы беларускай дзяржаўнасці. Неўзабаве, беларускае пытанне трактавалася выключна як унутраная праблема.

У склаўшайся сітуацыі канфлікт двух палітычных элітаў на тамтэйшым абшары быў проста непазбежны. Гэты канфлікт належыць да старонак, якія з'яўляюцца балючымі і драматычнымі для палякаў і беларусаў, аднак адлюстроўвае рэчаіснасць той ваеннай віхуры, якая бязлітасна ламала людскія лёсы, нацкоўвала брата на брата. Ва ўмовах ваеннага часу ў гэтай барацьбе варагуючым бакам не даводзілася грэбаваць сродкамі, у выніку гэта прывяло да праліцця братняй крыві. Асноўнай зброяй канфлікту выступалі ўзаемныя дэнунцыяцыі і ўзаемныя абвінавачванні палітычных апанентаў перад нямецкімі ўладамі.

У выніку польска-савецкага і польска-беларускага канфліктаў ахвярамі братазабойчай барацьбы па абодва бакі сталіся тысячы жыхароў паўночна-ўсходніх крэсаў, незалежна ад нацыянальнасці. У межах выканання прысудаў за дзяржаўныя злачынствы, а такса-

[111] W. Mędrzecki, *Polityka narodowościowa II Rzeczypospolitej a ukraińska akcja UPA w latach 1943-1944*, [w:], *Antypolska akcja OUN-UPA 1943-1944. Fakty i interpretacje*, Warszawa 2003, s. 7-10.

ма ў абставінах узброенага змагання, удзельнікамі польскага падполля было ліквідавана і знішчана некалькі соцень асобаў. У святле архіўных дакументаў не даводзіцца аднак казаць пра сістэматычны масавы антыбеларускі тэрор, тым больш супраць нявіннага цывільнага насельніцтва. Не адпавядаюць рэчаіснасці закіды і абвінавачванні Арміі Краёвай у ажыццяўленні сістэматычнага і мэтанакіраванага вынішчэння беларускага насельніцтва, паколькі кіраўніцтва гэтай узброенай структуры мела загад аднолькавага трактавання ўсіх польскіх грамадзянаў, незалежна ад нацыянальнага паходжання альбо веравызнання[112]. Акты тэрору прымяняліся ў дачыненні да асобаў, якія, з гледзішча польскага ўраду і інтарэсаў польскага народу, разглядаліся як палітычныя ворагі. На гэта жаўнеры АК мелі як юрыдычнае, гэтак і маральнае права.

Аналізуючы сітуацыю варта заўсёды памятаць, што беларускапольскі канфлікт на былых паўночна-ўсходніх землях 2-й Рэчы Паспалітай падчас нямецкай акупацыі не меў шырокага масавага характару. Ён пераважна ахопліваў толькі кола палітычна заангажаваных беларусаў і палякаў. Заклікі БНС і іншых беларускіх арганізацыяў знаходзілі мінімальны водгук сярод беларускага насельніцтва, якое працягвала жыць штодзённымі клопатамі. На думку сучасных нямецкіх гісторыкаў, нямецкая нацыянальная палітыка, накіраваная на распальванне польска-беларускіх антаганізмаў не дасягнула свайго поспеху па прычыне адсутнасці шырокай патэнцыйнай базы для вострых міжнацыянальных антаганізмаў. На карысць гэтай тэзы прамаўляюць, таксама, даныя як польскай, так і савецкай канспірацыяў. Так, згаданы раней сувязны савецкіх партызанаў у Наваградку Валянцін Таўлай у сваім рапарце адзначаў, што „як з польскага, гэтак і з беларускага боку, ён (антаганізм — Ю. Г.) не адлюстроўваў якіх-колечы імкненняў і жаданняў народных масаў, якія часткова свядома, а часткова кіруючыся разважлівым інстынктам не бралі ўдзелу ў гэтай палітыцы”[113]. Тым часам, у адным з рапартаў АК адзначалася, што „сітуацыя ў краіне нядрэнная (...) стаўленне да польскасці не ёсць варожае і стасункі паміж абодвума групамі супольнасці (беларусамі і палякамі — Ю. Г.) наогул някепскія”[114].

На дадзеным абшары насельніцтва не прывязвала значнай увагі да вызначэння нацыянальнасці. Значная частка мясцовага беларускага насельніцтва працягвала акрэсліваць сваю прыналежнасць як

[112] H. Piskunowicz, *Polskie podziemie a kwestia białoruska w latach 1941-1944*, s. 58.
[113] *Памяць. Навагрудскі раён*, Мінск 1996, с. 311.
[114] AAN, sygn.: 202-III-203, k. 48.

„тутэйшыя”. Шэраговае насельніцтва з цяжкасцю адгукалася на заклікі беларускіх нацыянальных сілаў. Нярэдка людзі добраахвотна ўступалі ў паліцыю альбо згаджаліся быць сябрамі БНС не пад уплывам нацыянальных пачуццяў альбо палітычных перакананняў, а з мэтай паляпшэння матэрыяльнага дабрабыту і ларатавання ўласнага жыцця. Як адзначалі камандзір Наваградскай акругі АК падпалкоўнік Януш Праўдзіц-Шляскі і шэф яго штабу капітан Станіслаў Сэндзяк галоўным хаўруснікам польскага падполля ў супрацьстаянні БНС было само беларускае насельніцтва, якое байкатавала палітычныя лозунгі. Апрача таго, штодзённае змаганне за выжыванне адсунула нацыянальныя антаганізмы на задні план, калі людзі былі заклапочаныя пытаннямі ратавання ўласнага жыцця[115]. Кажучы наконт антаганізмаў паміж жыхарамі тамтэйшага абшару падчас нямецкай акупацыі значна часцей спатыкаліся факты гвалту, якія мелі характар асабістых парахункаў. Ва ўмовах ваеннага часу склаліся вельмі спрыяльныя варункі дзеля рэалізацыі ўласнай помсты, якая абгрунтоўвалася палітычнымі матывамі. Да гэтага відаць варта дадаць, што істотнае месца ў стасунках паміж крэсавым насельніцтвам адыгрывалі крыўды, сваімі каранямі сягаючыя ў верасень 1939 г., якія сталіся адной з прычынаў дэнунцыяцыі ў першыя месяцы нямецкай акупацыі. Менавіта тут магчыма было найбольш выразна прасачыць учынкі нацыянальных непаразуменняў, паколькі пасля вераснёўскіх падзеяў у шматлікіх палякаў замацавалася перакананне аб беларусах як адвечных прыхільніках савецкай улады, што ў рэчаіснасці не адпавядала праўдзе[116].

На шчасце, паміж беларускім і польскім насельніцтвам на акупаванай тэрыторыі не найшлося месца для жудаснай братазабойчай масакры, якая назіралася ў польска-ўкраінскіх стасунках на Валыні альбо Усходняй Галіччыне. Гісторыя не ведае гэткіх выпадкаў у стасунках паміж беларусамі і палякамі. Гітлераўцы адмыслова праводзілі палітыку, накіраваную на распальванне нацыянальнай варожасці на акупаваных тэрыторыях, разлічваючы раз’яднаць паняволеныя народы і тым самым аблегчыць сваё панаванне на захопленых абшарах. Зараз аднак з упэўненасцю магчыма канстатаваць, што гэты разлік у адносінах да беларусаў і палякаў з самага

[115] А. Бракель, *Межнациональные конфликты как следствие национальной политики советской и немецкой властей (1939-1944)*, [у:] *Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць. Матэр. міжнародн. канф., Мінск, 22 красавіка 2004 г.*, Мінск 2005, с. 82.

[116] Шырэй: M. Wierzbicki, *Polacy i Białorusini w zaborze sowieckim. Stosunki polsko–białoruskie na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej pod okupacją sowiecką 1939-1941,* Warszawa 2000.

пачатку не меў ані палітычных, ані рэлігійных падставаў і быў наканаваны на паразу.

Нягледзячы на факты праяваў беларуска-польскага канфлікту, у гісторыі стасункаў паміж абодвума народамі непараўнальна больш прыкладаў беларуска-польскага братэрства па зброі. Дзесяткі тысячаў польскіх грамадзянаў беларускай нацыянальнасці, побач з палякамі, самаахвярна баранілі сваю Айчыну ў складзе Войска Польскага ў верасні 1939 г. Праваслаўныя беларусы гераічна змагаліся ў шэрагах фармаванняў Арміі Краёвай на Навагрудчыне і Віленшчыне, дзе, па розных ацэнках польскага камандавання, яны складалі ад 30% да 50% жаўнераў канспірацыі[117].

**Беларуская Нацыянальная [Народная]**
**Самапомач**
**Камітэт у Слоніме**

## Справаздача*

Дня 19 лістапада была зарганізаваная ў Слоніме Акруговае Кіраўніцтва БНС. Абставіны, пры якіх прышлося пачынаць працу, былі ўпрост немагчымыя. У самым Слоніме знайшлося ўсяго два беларусы, якія зараз-жа прыраклі сваю актыўную супрацу, гэта беларускі паэт С. Хмара (С. Сіняк) і беларускі кампазытар А. Валынчык, некалькі беларусоў хаця і зьявіліся, аднак да чыннае працы не прыступілі. Рэшта была настолькі затэрарызаваная палякамі, якія абсадзілі ўсе становішчы ў цывільнай адміністрацыі гораду і акругі (асабліва паліцыя на чале з Ушпікам), што баяліся нават адазвацца. І таму першыя крокі кіраўніцтва БНС былі накіраваныя на адшуканьне і змабілізаваньне да працы разцярушаных па вёсках акругі беларусаў — актывістаў, патрыётаў сваёй Бацькаўшчыны. Цывільныя ўстановы гораду і акругі, кіраўнікамі якіх ёсьць альбо расейцы, альбо „нібыта беларусы”, упрост пачалі спачатку байкатаваць усе пачынаньні кіраўніцтва БНС. Гэтак нягледзячы на адносныя загады аб перадачы рэчаў, сканфіскаваных у жыдоў, знаходзячыся ў распараджэньні Магістрату — у БНС дзеля зарганіза-

[117] Z. Boradyn, *Niemen rzeka niezgody...* s. 47.
* Правапіс і стыль дакумента захаваны ў арыгінале.

ваньня дапамогі патрабуючым, рэчы пераданыя ня былі і ўсё гэта было фактычна расьцягана польскай часткай насельніцтва гораду і палякамі-ўрадоўцамі, бо на чале складоў стаяць палякі. Цяпер гэтымі рэчамі ідзе шалёная спэкуляцыя, а патрабуючае дапамогі беларускае насельніцтва амаль што нічога не атрымала, тое-ж самае атрымалася і ў раёне Казлоўшчына, дзе былі вялікія склады гэтакіх-жа рэчаў.

Пасьля месячных захадаў БНС дабілася перадачы Магістратам у БНС будынку былога польскага Дому Людовага. З хвілінай перадачы дому ў рукі БНС, пры ім зарганізаваўся Беларускі Народны Хор і Драматычная Сэкцыя. 8 студзеня ў Беларускім Народным Доме адбылася ёлка для 1 500 дзяцей — школьнікаў горада Слоніма. На ёлцы пры дапамозе БНС дзецям разданыя былі дарункі-булачкі. 3-га сьнежня пры помачы БНС была абсаджана беларускім пэрсаналам Слонімская Гарадзкая Бібліятэка, у якой зьвілі сабе гняздо польскія шавіністы, затручваючы насельніцтва польскай нацыяналістычна-патрыятычнай літаратурай. Па ўзмоцняных і неаднаразовых захадах БНС зьніклі з вуліцаў гораду Слоніма, брудзячыя твар гораду, польскія надпісы крамаў, установ і прадпрыемстваў — закрасавалі беларускія шыльды. Дзякуючы грам. А. Васілені заступніка старшыні БНС, які быў прафарсованы на становішча сакратара магістрату — урадаваньне тут вядзецца ўжо на беларускай мове, тым часам Слонімская Павятовая Управа моцна трымаецца расейскай мовы. Адчыняны Беларускі Гасьцінны Дом, які можа зьмесьціць звыш 24 асобы. Па інтэрвэнцыі БНС усе сірацінцы, дзіцячыя садкі і дзіцячыя шпіталі абсаджаныя беларускім выхаваўчым і кіраўнічым пэрсаналам. Наогул пры помачы БНС беларусы, маючыя сярэднюю, альбо непоўную-сярэднюю асьвету, якія не мелі працы, у ліку 27 асобаў, цяпер ужо займаюць адпаведныя становішчы ў гарадзкіх установах і прадпрыемствах. Гатовіцца выданьне газэты „Слонімскі Голас" — рэдакцыйная калегія на чале з адказным рэдактарам грам. Р. Зыбайлам — старшынёй БНС Акругі прыступіла да ўрухомленьня друкарні і зьбіраньня матэрыялаў. Ужо гатовыя матэрыялы да друку першага нумару дзіцячага часопісу „Каласок", рэдактарам якога вызначаны беларускі паэт С. Пяюн (С. Новік). Да гэтае пары на перашкодзе стаяла адсутнасьць сваёй друкарні, бо існаваўшая ў Слоніме друкарня згарэла падчас ваенных падзеяў. Захадамі БНС знойдзены часьцічны шрыфт з друкарні ў Косаве. Адчыняны Беларускі Музэй, у якім знаходзіцца вялікая колькасьць вартасных экспанатаў, сабраных і захаваных дзякуючы сучаснаму дырэктару музэю грам. С. Новіку. У хуткім часе будуць адчынены тры сталоўкі БНС — арганізацыйная праца

ўжо распачалася. Адбылося паседжаньне ініцыятыўнае групы па арганізацыі беларускага каапэратыву.

Па ўстановах гораду і раёнаў праводзяцца зборкі грашовых ахвяраў на зімовую помач, пры чым частка грошаў ужо выдана на дапамогу патрабуючым.

Арганізацыйная праца па раёнах шпаркім крокам пайшла наперад, нягледзячы на ўсе перашкоды з боку польскіх і расейскіх элемэнтаў, прасьлізнуўшых у адміністрацыйныя ўстановы раёнаў і валасьцёў. Зарганізавана кіраўніцтва БНС ва ўсіх раёнах акругі. Найактыўнейшую працу праводзіць раённая БНС у Косаве. Пры ўсіх раёнах праводзяцца зборкі, у грашах і натуры, пры чым некаторыя вёскі выказваюць асаблівую ахвярнасьць.

Пры сёньняшніх абставінах, калі беларускае насельніцтва ўпрост адмыслова затэрарызавана прэпарованымі чуткамі аб польскай арміі Сікорскага, аб хуткім прыходзе амэрыканцаў, каб дапамагчы стварыць на нашай Бацькаўшчыне Польшчу, калі палякамі абсаджана палова Слонімскае паліцыі, палякамі абсаджаны ўсе лясныя ўрады, палякамі абсаджаная Слонімская Біржа Працы — няма мовы аб шырокім уздыме беларускіх мас Слонімшчыны на будову Новага Парадку, для адбудовы сваёй Бацькаўшчыны.

Толькі рашучая чыстка адміністрацыйных установаў ад польскіх элемэнтаў можа ўстрымаць раз'юшаную беспакараньнем польскую шавіністычную прапаганду супроць Нямецкага і Беларускага народаў і польскі тэрор.

Толькі тады будзе магчымасьць стуточна процідзейнічаць польска-бальшавіцкай тайнай прапагандзе і прыцягнуць да супрацоўніцтва ў БНС усё беларускае насельніцтва акругі.

Слонім, дня 16 студзеня 1942 г.

Старшыня Р. Зыбайла

*Крыніца: НАРБ, ф. 384, воп. 1, спр. 34, л. 12-14.*

**Стасунак палякоў і іх заарганізаванасьць***

У першую хвіліну асвабаджэньня Краю Нямецкімі Войскамі, дзякуючы сваёй заарганізованасьці, польская меншасьць пранікае ва ўсе цывільныя ўстановы Слонімскае акругі, а асабліва горада Слоніма. Ёсьць факты, што ўжо само пранікненьне ва ўста-

* Правапіс і стыль дакумента захаваны ў арыгінале.

новы палякаў праводзілася арганізавана па ўкасцы якогасьці мясцовага кіруючага цэнтру. Абсаджваліся ў першую чаргу ўстановы маючыя важнае значэньне, напрыклад, парадкавая паліцыя. У парадкавай паліцыі Слоніма больш палавіны палякоў, быўшых ваенных польскае арміі, між каторымі шмат завадовых падафіцэраў. На чале паліцыі стаў нехта Ушпік, былы польскі паліцэйскі, праследаваўшы беларусаў, хоць сам быў з паходжаньня беларус, але даўно стаўшы польскім нацыяналістам. Ягоным памочнікам ёсьць паляк Боркоўскі — сержант польскае арміі, другі памочнік Хмелеўскі — паляк і агэнт польскае паліцыі. Апанаваўшы паліцыю і стварыўшы з яе польскую нацыяналістычную пляцоўку, з польскай мовай і камандаваньнем, палякі ўзяліся за тэрарызаваньне беларускага сялянства, беларусоў якія хацелі-б актыўна дапамагаць будаваць Новы, прынесяны нам Вялікай Нямецкай Арміяй, — Парадак. Вёску пачалі апаясываць сыстэматычна фабрыкаванымі слухамі, што тут будзе Польшча, што кожны хто спрабуе выступіць супроць польскае акцыі, будзе застрэляны як камуніст, бо ў руках палякоў паліцыя і ўлада, а яны ўжо здолеюць вытлумачыцца перад Нямецкімі Уладамі.

Дайшло да такога цынізму, што палякі каб лягчэй весьці сваю нацыяналістычную работу і ўнешкадліваць актыўных беларусаў, стварылі былі ў Слоніме гэтак званы „Беларускі Нацыянальны Камітэт” на чале з ненавіснікам усяго беларускага Ушпікам і яму падобным Рымшай. Па нейкім часе Нямецкія Уляды аднак праўдзівае аблічча гэтага камітэту дагледзілі і яго зліквідавалі. Усе ўстановы горада Слоніма на той момант абсаджаныя палякамі на чале з бургамістрам ксяндзом Грахольскім.

Выкарыстоўваючы сваё ўрадавае палажэньне, палякі пачалі і прадаўжаюць да сягоньняшняга дня прасьледаваньне беларускага насельніцтва акругі, стараючыся ўсімі магчымымі правакацыйнымі спосабамі тварыць на вёсцы антынямецкія настроі. Робіцца гэта хоць-бы рознымі беспраўнымі канфіскацыямі ў сялянстве, безпадстаўным біцьцём сялян на сваю руку, супроць загадаў Нямецкіх Уладаў! А побач з гэтым безперапыўныя дзень у дзень правакацыйныя чуткі: „за месяц, за год, але тут будзе Польшча, Сікорскі ў Вільні, Сікорскі ў Коўне” і г.д. Супроць кожнага беларуса, які згадзіўшыся да працы ў якой-колечы ўстанове і прабуе загаварыць і ўрадаваць у беларускай мове, замест польскай, арганізоўваюцца розныя правакацыі, даносы, абвінавачваньні ў камунізьме і гэтак далей.

У горадзе Слоніме і акрузе напэўна існуюць групы ПОВ дзеля таго, што арганізацыя гэта існавала за часоў бальшавіцкіх і была

праз іх выкрыта (арышт ПОВ-авякаў у 1940 г.), а з прыходам Нямецкіх Уладаў — знаходзяцца на вольнасьці і працуюць безумоўна ў гэтым-жа напрамку далей. Напрыклад, Сарнэцкі — былы пасол ОЗН-у вул. Каманданская 3 — да якога часта збіраюцца нейкія таямнічыя асобы і часта выязджае да Варшавы.

Палякі абсадзілі ў Слонімскай акрузе ўсё лясьніцтва (пасьля паліцыі другая па важнасьці, са стратэгічнага боку, установа: аружжа і веданьне лясных абшараў), так сама палякамі абсаджаныя і іншыя важныя ўстановы горада: Біржа Працы, аправізацыя гарадзкой управы, электроўня, пажарная ахова — „легіяніст Грамыла" і г.д. Гэта непоўны пералік устаноў апанаваных палякамі, апанованых не дзеля служэньня Новаму Парадку, Непераможнай Арміі Адольфа Гітлера, але — для сабатажу яго. Дзеля арганізацыі дывэрсійнай работы ў карысьць сусьветнае Рузвэльтоўска-жыдоўскае плютакратыі.

Польская прапаганда супроць Вялікага Нямецкага Народу набрала патворных памераў, прэпаруюцца весткі аб „арміі Сікорскага", якая заняла ўжо Рыгу, Вільню, Коўна, аб „пагромах" Нямецкае Арміі, аб амэрыканскіх войсках, якія ідуць асвабаджаць Польшчу. Адным словам стараюцца пасеяць недавер між беларускім насельніцтвам і ягонымі Асвабадзіцелямі.

Уся гэтая злосная прапаганда ненавісьці да Нямецкага і Беларускага народаў выходзіць ад агульна знаных польскіх патрыётаў, як ОЗН-вец Сарнэцкі, доктар Дэдэль, перахрышчаны жыд Фэльдман — былы польскі сышчык, Хмелеўскі, Браўнова і інш.

Слонім, дня 16 студзеня 1942 г.

Подпіс: Р. Зыбайла

*Надпіс ад рукі*: Аб гэтым злажыць адпаведны экзэмпляр для Гэбітскамісара.

Подпіс: Р. Зыбайла

*Крыніца: НАРБ, ф. 384, воп. 1, спр. 34, л. 7-9.*

**Беларуская Народная**
**Самапомач**
**Камітэт у Слоніме**

**Памятная нататка**

Польская нацыянальная меншасць ужо даўно перашкаджае ўмацаваньню новага нямецкага парадку, які ў нашу краіну прынесла армія вялікага нямецкага народа і яго правадыра Адольфа Гітлера. Польская нацыянальная меншасць з усёй моцы сваімі акцыямі перашкаджае збліжэнню нямецкіх уладаў і нямецкага народу з беларускім народам.

Захапіўшы ўсе пасады ў цывільных і гарадскіх дзяржаўных установах, на прадпрыемствах і сельскагаспадарчых прадпрыемствах, палякі праводзяць прыхаваны сабатаж. Яны праводзяць шкодную дзяржаве прапаганду супраць нямецкага народа і тэрарызуюць беларускае насельніцтва раёна, пагражаючы ім адраджэньнем „польскай дзяржавы" на нашай Бацькаўшчыне пасля „паразы" Нямецкага Рэйху.

У апошні час яны адчуваюць сябе ў поўнай небясьпецы і таму дазваляюць сабе зьдзекавацца з беларусаў.

Мы, беларусы, у дадзены момант апынуліся фактычна ў небяспецы з боку польскіх імперыялістычных бандаў, якія апанавалі ўрадавыя ўстановы. Польская акцыя скіраваная не толькі супраць нас, але ў асаблівасці супраць нашага хаўрусніка — нямецкага народу, супраць вялікай барацьбы за Новую Еўропу.

Мы ўздымаем алярм! Наш каварны вораг не спіць, праз выкарыстанне ўсіх сваіх становішчаў, ён з дня на дзень распаўсюджвае сярод масаў беларускага насельніцтва ў краі атруту варожасці для непераможнай нямецкай арміі. Выкарыстоўваючы высокія становішчы ён спрабуе праз свае крывавыя банды Сікорскага і бальшавікоў пасеіць страх.

У сувязі з гэтым мы звяртаемся да Вас, вялікашаноўны спадар Гэбітскамісар, з просьбай аб дапамозе ў змаганні з польскімі нацыяналістамі, зграяй ворагаў дзяржавы.

Мы звяртаемся да Вас з просьбай узяць нас пад Вашу вялікую ахову перад небяспечным ворагам.

Толькі Вашая ахова, толькі Вашая дапамога змогуць дапамагчы нам ачысціць горад і акругу ад польскіх агентаў Рузвельта і Чэрчыля, спыніць варожую акцыю сярод вясковага беларускага насель-

ніцтва і дапамогуць яму зрабіць выбар на карысць працы для Новага Парадку.

БНС просіць Вас звольніць дзейснага сёння кіраўніка раённай управы Слоніма, а таксама расейца Сагейдакоўскага і замест яго прызначыць беларуса Рыгорам Зыбайлам.

Таксама просім змяніць выхаваўчы персанал дзіцячых прытулкаў, у якіх знаходзяцца беларускія дзеці, каб спыніць паланізацыю гэтых дзяцей. Мы звяртаем увагу на тое, што гарадскі бурмістр 4 лістапада 1941 г. звольніў польку А. Барадзюк, але ўжо на наступны дзень інспектар пры акруговым камісары Колерануляваў гэта рашэнне. Гэты ўчынак яшчэ больш падбухторыў палякаў да здзекаў з беларусаў, паколькі ў іх склалася ўражанне, што нямецкая адміністрацыя падтрымлівае палякаў у змаганні з беларусамі.

БНС ветліва просіць звольніць польскіх шавіністаў з кіраўніцтва біржы працы.

БНС просіць па магчымасці ачысціць ад палякаў гарадскую ўправу.

На думку БНС неабходна павыкідаць польскіх настаўнікаў з беларускіх школаў, паколькі яны псуюць беларускіх дзетак.

БНС надае шмат сваёй увагі кіраўніцтву тартаку, дзе з боку палякаў праводзіцца сабатаж. У прыватнасці, пасля заклiку збіраць цёплую вопратку гэты крок быў патрактаваны як адсутнасць гераізму ў немцаў. З цынічным жартам пачуўся адказ: „Ды немцы нават у лес баяцца ісці!”

Ёсць пытанні наконт знаходжання палякаў у кіраўніцтве.

БНС звяртае Вашую ўвагу на прысутнасць польскай акцыі ва ўсіх мясцовых дзяржустановах, якая непасрэдным чынам застаецца паза ўвагай кіраўніцтва Гэбітскамісарыяту. Так, напрыклад, аддзел індустрыі ачольвае паляк Савіцкі, які на працы, у тым ліку ў службовай карэспандэнцыі, ужывае польскую мову замест беларускай. На кахальнай фабрыцы пасля распараджэння Гэбітскамісара быў звольнены беларус В. Якубовіч, а прызначаны замест яго паляк. Пры тым, было публічна абвешчана, што зараз для беларусаў няма наяўных месцаў.

БНС звяртае, таксама, увагу на тое, што па-польску размаўляе і слонімская паліцыя парадку. Таму неўзабаве, беларускае насельніцтва раёна не мае пашаны да паліцыі. Гэта адбываецца таму, што беларускае насельніцтва, якое не зносіць палякаў, чуючы польскую мову з вуснаў паліцыянтаў, пачынае ставіцца да іх як да ворагаў.

БНС просіць забараніць урадаўцам ужыванне польскай мовы ў службовы час, бо гэта адпалохвае беларускае насельніцтва ад удзелу ў будаўніцтве Новага Парадку.

БНС ветліва просіць вялікашаноўнага Спадара Гэбітскамісара зра-

біць адпаведныя захады ў напрамку звальнення адусюль палякаў.

Як пераконвае досвед, толькі там, дзе палякаў ужо няма ў адміністрацыі, як напрыклад у Косаве і Івацэвічах, акцыя самадапамогі мае добрую глебу, развіваецца і найбольш плённа дзейнічае сярод сельскага насельніцтва. Менавіта там сяляне адкрыта ахвяруюць у большых памерах зерне і тысячы маркаў. Вёска ў поўнай гатоўнасці адгукаецца на заклік збіраць рэчы і сельскагаспадарчую прадукцыю для арміі. Тым часам, у месцах, дзе палякі яшчэ працуюць ва ўправах, пануе страх і беларуская вёска не адважваецца спрычыніцца да адбудовы Бацькаўшчыны і новага Парадку.

У сувязі з гэтым, мы яшчэ раз звяртаемся да Вас, Вялікашаноўны Спадар Гэбітскамісар, з вялікай просьбай звярнуць увагу на нашую памятную нататку, абараніць нас, узяўшы пад ахову нямецкага народа і даць магчымасць беларускаму народу далучыцца да працы на ніве агульнай справы пабудовы Новай Еўропы і дапамагчы адбудаваць нашу Бацькаўшчыну.

Слонім, дня 10 лютага 1942 г.

Старшыня Р. Зыбайла

*Крыніца: НАРБ, ф. 384, воп. 1, спр. 34, л. 1-3. Пераклад з нямецкай мовы.*

**Справаздача настрою жыхарства на тэрэне Качаноўскай воласьці Нясвіжскага павету***

Партызаншчына з кожным днём узмацняецца, дзякуючы чырвоным жыдоўскім агітатарам і польскім памочнікам. Для насельніцтва жыццё становіцца немажлівым. Кожную ноч рабункі, напады і забойствы.

30.3.1943 года набор рабочай сілы ў Нямеччыну па прычыне прапаганды чырвоных бандытаў і польскіх падпольных агентаў, што ў Нямеччыне кепска, то ніводзін паляк на камісію не з’явіўся, дзе ёсьць па 3-4 маладыя работнікі і яны хаваюцца ад паліцыі, чакаючы вясны і іх лёгка забяруць у лес, бо ў лесе ёсьць шмат польскіх афіцэраў, якія з іх ствараюць атрады пад назовам чырвоный банды, дзеля чаго трэба непазбежна прыняць меры і вывезці гэтых людзей на работу ў Нямеччыну.

Часовы паварот італьянскіх войскаў з Усходняга фронту моцна падняў дух палякаў, так што італьянцы не хочуць ваяваць і ў чырвонай арміі і ў арміі генерала Сікорскага ёсьць шмат палякаў.

Набор рабочай сілы можна вольна і спакойна правесьці толькі

* Правапіс і стыль дакумента захаваны ў арыгінале.

трэба патлумачыць людзям куды і навошта яны едуць, то кожны старшыня ведае хто можа ехаць у Нямеччыну на работу. Каб народ не баяўся ўцякаць у лес, бо такое становішча людзей лёгка паддаецца агітацыі чырвоных бандытаў.

Зазначаю, што трэба ўбраць агентаў і супольнікаў, якія маюць моцную сувязь з партызанамі і ў якіх ужо ёсьць браты і швагры ў лесе ў партызанах.

1) Зянковіч Уладзімір Мечыславаў — вёска Пляшчэвічы
2) Зубовіч Казімір Аляксандраў — вёска Пляшчэвічы
3) Саковіч Мечыслаў Францаў — вёска Качановічы
4) Рачкевіч Казімір Людвікаў — вёска Качановічы, які пабіў брата і ўцёк ў лес, дзе сабраў банду з раней уцёклых палякаў
5) Зянковіч Валенты Антонаў — вёска Качановічы
6) Дзішук Міхаіл Аляксандраў — вёска Качановічы
7) Татур Адам Вікентаў — вёска Качановічы, які ўжо вярнуўся з партызанаў, цяпер уладкаваўся працаваць на будаўніцтве дарогі ў Клецку
8) Шумоўскі Адам Іванаў — вёска Качановічы
9) Васілеўскі Язэп Іванаў — вёска Слаўкава, Сейлавіцкая воласьць
10) Астрэйка Казімір Антонаў — вёска Слаўкава, Сейлавіцкая воласьць
11) Астрэйка Міхась Кастусёў — вёска Слаўкава, Сейлавіцкая воласьць
12) Гардзеевіч Іван Іванаў — вёска Слаўкава, Сейлавіцкая воласьць
13) Грыневецкі Вітольд Адамаў — вёска Слаўкава, Сейлавіцкая воласьць
14) Вашкевіч Мечыслаў Казіміраў — вёска Слаўкава, Сейлавіцкая воласьць
15) Секерыцкі Мечыслаў Адамаў — вёска Слаўкава, Сейлавіцкая воласьць
16) Цьвірко Зянон Антонаў — вёска Слаўкава, Сейлавіцкая воласьць
17) Зубовіч Язэп — вёска Сейлавічы, польскі актывіст падпольнай арганізацыі
18) Маеўскі Лявон — Нясьвіж. Паляк, польскі актывіст, правакатар нямецкіх уладаў і яго спульнік Салавей Антон — вёска Качановічы
19) Зянкевіч Адам Тадэўшаў — вёска Качановічы. Польскі афіцэр-асаднік і яго памочнік Мардусэвіч Іван, жыве ў Нясьвіжы, польскі падхаронжы
20) Жэбуртовіч Іван Уладзіміраў — вёска Мысліва, які забіраў у Слаўкаве з партызанамі маладых хлопцаў у партызанскія банды і яго памочнік Пазняк з Дубеек, які жыве ў Нясьвіжы

і прадае ў краме хлеб.

Усіх гэтых людзей трэба выслаць на работу ў Нямеччыну, каб не пашлі ў лес. Зазначаю, што сярод іх вядзецца шырокая бандыцкая агітацыя. Адначасова зазначаю, што на тэрыторыі Капыльскага раёна пасьпяхова арганізуецца бандыцкая армія бандытаў (рознага зброду) з вярнуўшыхся з Палесься, што перавышае 2000 чалавек, якія маюць кіраўніцтва 6 польскіх афіцэраў з былога 27 уланскага палка ў Нясьвіжы.

Бандыты штодзённа выязджаюць на рабункі ў Нясьвіжскі раён, дзе забіраюць коні, каровы, абутак і вопратку. Бандыты выязджаюць у колькасьці ад 30 да 80 чалавек, якімі разрабаваныя зусім сяляне Юнаўскай і Качаноўскай валасьцёў. Сялянам няма магчымасьці працаваць на пасеўных палях, якія прылягаюць да мяжы Копыльскага раёна. Бандытамі заняты былыя лагеры: Лавы, Язьвіны, Заруднае, Рымашы, Лотвіны, пасёлак Жавалкі, Наруці, Траянава, Куцоўшчына, Бабоўня і шмат іншых сёлаў, прылягаючых да былой польска-савецкай мяжы насупраць Нясьвіжскага раёна, адкуль бандыты вычэрпваюць увесь хлеб для прадукцыі бандыцкай арміі.

Зазначаю, што ў бандах ёсьць спэцыяльныя польскія атрады, якія кіруюцца польскімі афіцэрамі, якія пры аблаве разбягаюцца і хаваюцца па вёсках сярод польскага насельніцтва. У вышэй паданых вёсках ёсьць прыблізна 15 чалавек бандытаў з мясцовых сялянаў Капыльскага раёна. Зазначаю, што з Раёўкі і Кукавіч выходзяць напады на рабунак на Нясьвіжскі раён, якія вярнуліся з лесу...

Нясьвіж, 2.5.1943.

С. Харытончык

*Крыніца: НАРБ, ф. 370, воп. 6, спр. 48. л. 137-139.*

## СЬПІС
## палякаў бандытаў, якія ўжо даўно ў лесе ў польскіх партызанскіх аддзелах і рабуюць на тэрыторыі Нясвіжскага раёна (Качаноўская і Юшэўская воласьць), якія хаваюцца на тэрыторыі Капыльскага раёна*

1) Зантовіч Уладзімір — польскі афіцэр, а цяпер камандзір партызанскага польскага аддзела

2) Флерыяновіч Іван Станіславаў — польскі сяржант

* Правапіс і стыль дакумента захаваны ў арыгінале.

3) Тамашэўскі Генюсь Станіслававіч — польскі сяржант матрос
4) Невяроўскі Язэп Пятроў — стралец
5) Высоцкі Валек — камандзір атрада, жыхар вёскі Месенкоўшчына
6) Маліноўскі Іван — з Радкова, якога бацька працуе дзесьці на будаўніцтве дарогі ў Клецку і часта дае зводкі сыну
7) Гнецько — вёска Фольваркоўцы, камандзір атрада
8) Зубовіч Антон Аляксандраў — які хаваецца на тэрыторыі Капыльскага раёна пад чужым прозьвішчам, вёска Вянья
9) Лукашэвіч Зянон — Вялікія Дубейкі

Вышэй паданыя бандыты ўжо шмат абрабавалі і зьнішчылі людзей і часта бываюць у сваіх кроўных: Радкевіча Івана — вёска Пляшчэвічы, Тамашэўскага Зянона — вёска Пляшчэвічы, Зубовіча Альгуся — вёска Пляшчэвічы, дзе бандыты часта п'юць гарэлку, Зенковіча Уладзіміра Мечыслававіча — вёска Пляшчэвічы, Лазоўскага Казіміра — вёска Пляшчэвічы, Касьцюшкі Івана — маёнтак Кукавічы, якога брат у бандзе. Табароўскага Калекса — Дубейкі Вялікія, Лукашэвіча Франца — В. Дубейкі, Рымашэўскага Адама — В. Дубейкі, былы савецкі дэпутат. Усе вышэй паданыя асобы маюць сувязь з бандытамі і п'юць з імі гарэлку.

Нясьвіж, 2.5.1943.

С. Харытончык

*Крыніца: НАРБ, ф. 370, воп. 6, спр. 48. л. 141.*

**Да ведама Нямецкіх Ваенных Часьцей**

**аб тым, што творыцца на былой польска-савецкай мяжы Капыльскага павету. Паласа шырынёй да 9 км., даўжынёй да 80 км., пачынаючы да Узды і да шашы Брэст—Масква***

Усе вёскі, якія знаходзяцца на вышэйзгаданай тэрыторыі ахопленыя прапагандай і арганізацыяй пад назвай „Тылавой краснай арміі". У згаданай паласе ўжо знаходзіцца шмат зарганізаваных бандаў, утвораных супольным польска-жыдоўскім камуністычным камітэтам, якім кіруе Масква пры дапамозе радыёапаратаў, якія захоўваюцца на згаданай тэрыторыі. Пару тыдняў таму з парашу-

* Правапіс і стыль дакумента захаваны ў арыгінале.

таў было скінута каля леса шмат каманднага складу польскіх афіцэраў і савецкіх камісараў на чале з Мысьяковым (...) Усе заграніваныя банды выязджаюць ў Нясьвіжскі, Клецкі і Мірскі раёны, робячы напады, пасьля чаго вяртаюцца назад у Капыльскі раён, дзе маюць лагеры і хаваюцца. Зазначаю, што бандыты ў Копыльскім раёне праводзяць вярбоўку моладзі ў армію. Для гэтага хачу падаць месцы іх лагераў. 1) Лавы, дзе знаходзіцца галоўны штаб у лесе. 2) Язьвіны, Засьцеб'е, Гута, Зарудня, Рымашы, Лотвіны, Забалоцьце, Осава, Бабоўня, Каласоўшчына, Вын'я, Траянава, Нівоцы, Кудзіновічы, Пацейкі, Жавалкі, дзе знаходзяцца галоўны штаб і ўначы спушчаюцца самалёты (...)

Зазначаю, што ўсе палякі, якія ўцякаюць з усіх раёнаў Заходняй Беларусі ў Капыльскі раён, каб укрыць таямніцу польскай падпольнай арганізацыі ў Заходняй Беларусі. Якая трымае шчыльную сувязь з партызанамі „чырвонай тылавой арміі", якая знаходзіцца ў Капыльскім раёне. І ўсе прыбыўшыя польскія афіцэры з арганізацыі генерала Сікорскага называюць сябе „чырвонымі афіцэрамі". Нават ужо нямала ўцякло польскіх жанчынаў, якія працавалі ў адміністрацыі і цяпер яны знаходзяцца ў партызанах у Капыльскім раёне. Мадам Эбэль — якая сябе падавала за фольксдойча і ўзяла сабе за супольніка хлопца Салаўя Васіля, кантралёра млыноў Нясьвіжскага ЗО. У дню 23 траўня 1943 г. два ваеннапалонныя, якія працавалі ў вёсцы Вайнілавічы Нясьвіжскага павету замардаваўшы пастарунковага Караля і забраўшы ў яго зброю ўцяклі ў Капыльскі раён. Хачу падаць колькасьць палякаў Нясьвіжскага раёна, якія ўжо пайшлі ў партызаны ў Капыльскі раён (гл. папярэдні дакумент — Ю. Г.).

Зазначаю, што трэба ўбраць агентаў і супольнікаў, якія маюць моцную сувязь з партызанамі і ў якіх ёсьць ужо браты і швагры ў лесе. Цяжка аднак высьвятліць прозьвішчы ўсіх палякаў, якія ўцяклі з Заходняй Беларусі ў Капыльскі раён у партызаны (...)

Нясьвіж, дня 24.5.1943.

С. Харытончык

*Крыніца: НАРБ, ф. 370, воп. 6, спр. 48. л. 84-86.*


**Streszczenie**

Po napaści Niemiec na ZSRR latem 1941 r. na Białoruś przybyli działacze utworzonego wcześniej w Rzeszy Białoruskiego Komitetu Samopomocy. Liczyli oni, że przy pomocy Niemiec uda się zbudować białoruskie państwo narodowe. W pierwszych miesiącach okupacji niemieckiej niższe szczeble administracji i policji pomocniczej zostały obsadzone przez Polaków, często współpracujących ze Związkiem Walki Zbrojnej. Wiosną 1942 r.

Niemcy dokonali czystek w administracji Okręgu Generalnego Białoruś usuwając, pod zarzutem współpracy z podziemiem, część urzędników polskich. Ich miejsce zajęli działacze białoruscy, na czele z Iwanem Jermaczenką. Za zgodą Niemców Białorusini przystąpili do tworzenia Białoruskiej Samopomocy Ludowej, którą zamierzali później przekształcić w organ administracji przyszłego państwa. Rywalizacja o miejsce w niemieckim aparacie okupacyjnym między Polakami i Białorusinami przerodziła się w konflikt racji stanu. Starania białoruskie o zbudowanie własnego państwa Polacy odbierali jako zagrożenie utraty ziem północno-wschodnich II Rzeczypospolitej. Polską obecność polityczną i zbrojną Białorusini traktowali jako relikt przedwojennej okupacji Zachodniej Białorusi. Działania na rzecz osłabienia przeciwnika prowadzono różnymi metodami, najczęściej przy wykorzystaniu niemieckiego aparatu przemocy, drogą denucjacji, donosów, rzadziej w wyniku bezpośrednich działań. Według relacji dowódcy nowogródzkiego zgrupowania AK, jego podwładni wykonali ponad 300 wyroków śmierci na Białorusinach z powodu niezachowania lojalności wobec państwa polskiego oraz 80 osób wydali władzom niemieckim. Polacy najczęściej donosili na Białorusinów wskazując ich jako sympatyków komunizmu. Białorusini wskazywali na powiązania działaczy polskich z akowskim podziemiem. Konflikt polsko-białoruski najwięcej ofiar pochłonął w okręgu lidzkim.